ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма»
Цэнтральная раённая бібліятэка
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# «Мовы друкаванай чароўныя словы»

***Зборнік сцэнарных матэрыялаў да Дня беларускага пісьменства і друку***

Кобрын, 2017

ББК 78.374.3
Мо 74

Мовы друкаванай  чароўныя словы : зборнік сцэнарных матэрыялаў да Дня беларускага пісьменства і друку / ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. – Кобрын, 2017. – 88 с.

У зборнік увайшлі сцэнарыі да Дня беларускага пісьменства і друку. Пры складанні зборніка выкарыстаны сцэнарныя матэрыялы з часопісаў “Бібліятэка прапануе”, “Роднае слова” і матэрыялы аддзела бібліятэчнага маркетынгу.

Дадзенае выданне прызначана ў дапамогу супрацоўнікам публічных бібліятэк, настаўнікам і ўсім тым, хто зацікаўлены ў правядзенні мерапрыемстваў літаратурнай тэматыкі.

Склад.:  А. М. Міхейкіна-Белякова

© ДУК “Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма”

## ЗМЕСТ


- СА СЛАЎНАГА ПОЛАЦКА РОДАМ...
  літаратурная вечарына ________________________________ С. 4 – 15
- “ЯКІ Ж ГЭТА ЦУД — СЛОВА, МОВА ТВАЯ!”
  літаратурна музычная кампазіцыя ________________________С. 16 – 27
- ФРАНЦЫСК СКАРЫНА — ПЕРШАДРУКАР, АСВЕТНІК, ГУМАНІСТ
  вусны часопіс ________________________________________С. 28 – 32
- ПРАЗДНИК ТОРЖЕСТВА КНИГИ
  літаратурна- гульнявая праграма ________________________С. 33 – 38
- КРЫНІЦА РАЗУМНАГА, ДОБРАГА, ВЕЧНАГА
  літаратурнае свята ____________________________________ С. 39 – 44
- ПРАЗ СМУТУ СТАГОДДЗЯЎ ДАЖЫЛА ДА НАС СЛОВА
  літаратурна-музычная вечарына _________________________ С. 45 – 48
- ДУХОЎНАЯ КНІГА — КРЫНІЦА ВЯЛІКАЙ МУДРАСЦІ
  літаратурна-музычная кампазіцыя _______________________ С. 49 – 54
- ЧЫТАЕМ РОДНЫ КУТ, ЯК КНІГУ
  літаратурнае свята_____________________________________ С. 55 – 70
- ЕВФРОСИНЬЯ ПОЛОЦКАЯ: УЧИТЕЛЬ, ВОСПИТАТЕЛЬ И БИЛИОТЕКАРЬ: СОВРЕМЕННЫЙ ВЗГЛЯД
  вусны часопіс ________________________________________ С. 71 – 78
- “СВЕТАЕТ СВЕТОМ ЧЕРЕЗ ТЕМНОТУ ВЕКОВ СВЯТОЕ ИМЯ ЕВФРОСИНЬИ”
  літаратурна-музычная кампазіцыя ________________________ С. 79 – 85
- БЕЛАРУСЬ — КАЛЫСКА КНІГАДРУКАВАННЯ ЎСХОДНЯЙ ЕЎРОПЫ
  крыжаванка___________________________________________ С. 86 – 87

## СА СЛАЎНАГА ПОЛАЦКА РОДАМ…

*Літаратурная вечарына*

*Яфімава М. Б. Зямля бацкоў, зямля святая : матэрыял для правядзення літ. вечарын / М. Б. Яфімава. – Мінск : ВДП “Нар. асвета”, 1997. – 192 с.*

*З улікам нацыянальнай спецыфікі ўпрыгожана зала, над сцэнай - плакат са словамі “Сын зямлі беларускай – Скарына”. Удзельнічаюць: вядучыя, чытальнікі, у тым ліку выканаўцы роляў Скарыны, Маргарыты, Старца і інш.*

**1-ы вядучы** *(перад заслонай)*
Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны,
Аб горадзе Полацку слава ішла, -
Друкар там выдатны Георгій Скарына,
Што зоры, рассыпаў па роднай краіне
Крыштальныя словы навукі-святла;
Нямала народаў з крыніц яго піла
І брала ад мудрасці вечны агонь,
У літарах першых знаходзячы сілу...
Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла
Такога выдатнага сына свайго!

Пятрусь Броўка. Беларусь (урывак)

*Адкрываецца заслона, на задніку — абрысы старажытнага горада, можна паказаць фотаздымак ці малюнак па эпідыяскопе або слайды па дыяпраектары. На сцэне на камяні або на ўслончыку сядзіць стары чалавек у світцы, з кіем. Гучыць арганная музыка.*

**Стары.** Дзень 6 сакавіка 1486 года запомніўся ўсім тады ў Полацку, ды і не толькі ў Полацку.

Ранішняе сонца, якое цешыла ўжо вясновым цяплом, раптам пачало засланяцца цемраю. Людзі з жахам глядзелі, як яно ўсё меншала і меншала. Ці не канец свету? Чорны цень хутка пабег па зямлі. *(Святло часткова выводзіцца. Стары ўстае.)* Раптам зусім сцямнела. Набожныя пачалі маліцца... *(Гучаць званы, спачатку ціха, потым мацней.)*

Гулка бухалі званы полацкіх сабораў. Узбуджаныя, зарыкалі каровы, забрахалі сабакі. Суцэльная цемра схавала ўсё. І людзі адчулі страшэнны холад.

Але праз хвілю сонца зноў выбліснула. І ўсе ўсцешна ўздыхнулі... *(Званы сціхаюць.)*

Мабыць, якраз у гэты час у сям'і небагатага полацкага купца Лукі Скарыны нарадзіўся сын — будучы славуты беларускі першадрукар Францыск Скарына. Як бы ўспамін аб тым дні зацьмення на гравюрах кніг Францыска Скарыны будзе сустракацца сонечны дыск, прыслонены паўмесяцам.

*Выходзіць бабка-павітуха, нестарая яшчэ жанчына. Гучыць мелодыя беларускай калыханкі, на яе фоне чытаюцца наступныя словы.*

**Жанчына**. Бабка-павітуха, пакліканая ў дом купца Лукі Скарыны, абмываючы немаўля, прыгаворвала (*нібы люляе дзіця на руках і рэчытатывам напявае):*

А дай, божа, гэтай дзіцяці
Усякую долю ўзяці:
І хлебавую, і салявую,
Трэцюю — здаровецкую...
Хай будзе вельмі вучоным малайцом,
Хай будзе ў бацьку — купцом!

Анатоль Клышка. Урывак з кнігі
“Францыск Скарына,
альбо Як да нас прыйшла кніга”

**Стары.** Вельмі вучоным чалавекам стане Францыск, а не купцом. Душу яго запаланілі кнігі.

**Скарына.** Душу маю запаланілі кнігі,
Яны і днём і ноччу сняцца мне...
Я гандляваць не буду...
Лічу я кнігі скарбамі сваімі.
Хачу, каб непісьменнасці імгла
Святло, што выпраменьваецца імі,
Не зяцямніла, не перамагла!

Уладзімір Скарынкін.
Астральны знак Францыска

*Пасля паўзы Францыск працягвае:*

Радзіма, я пакінуў сам свае лясы,
Палі, гарады і сёлы,
Пайшоў у свет шукаць я для цябе
Святло навук!..

Станіслаў Шушкевіч.
Скарына ў Празе

*На сцэне застаецца толькі Стары. Звоняць гулка званы.*

**Стары**. Польшча. У 1504 годзе беларускі юнак Францыск Скарына паступіў вучыцца ў Кракаўскі універсітэт на факультэт свабодных навук (цяпер філасофскі), а 14 снежня 1506 года разам з пятнаццаццю іншымі выпускнікамі ён абараняў права на званне бакалаўра.

**Вядучы**. Уявім, як гэта магло быць. Паглядзіце інсцэніраваны ўрывак з рамана М. Садковіча і Я. Львова "Георгій Скарына" *(Стары ідзе са сцэны.)*

*Зацемненая сцэна, гараць свечкі. Калі на момант святло гасне, выносіцца на сярэдзіну сцэны стол, за ім сядзяць у мантыях і берэтах вучоныя (3-4 чалавекі), адзін з іх (прафесар Глагоўскі) трымае ў руцэ званочак. З абодвух бакоў стала стаяць кафедры. Каля адной — на лаўцы сядзяць Скарына і яго сябры, каля другой — рыцар фон Райхенберг са сваімі паплечнікамі.*

**Прафесар Глагоўскі** *(звоніць званочкам, устае)*. На суд вучоных выносіцца трактат аб тым, якое месца ў навуцы і адукацыі чалавецтва займаюць кнігі свяшчэннага пісання — Бібліі. Растлумачыць сіе схаляр Францыск Скарына, які прэтэндуе на вучоную ступень бакалаўра. Кожны, хто пажадае, можа ўступіць з ім у спрэчку, абвергнуць выказаныя ім меркаванні. Францыск Скарына, займі месца за гэтай кафедрай.

*Францыск хвалюецца, не адразу ўстае.*

**Прафесар Глагоўскі** *(паўтарае)*. Францыск!

**Студэнты** *(сядзяць побач са Скарынам)*. Ідзі, Франэк, ідзі!

*Францыск Скарына ўстае і ідзе да кафедры. Студэнты, што сядзяць побач з арыстакратам баронам фон Райхенбергам, і сам ён скептычпа глядзяць на Францыска, адзін з іх нешта шэпча Райхенбергу, той у адказ смяецца.*

**Скарына** *(стараецца гаварыць упэўнена, цвёрда)*. Я, Францыск, сын Скарыны са слаўнага горада Полацка... асмеліўся перад высокім сінклітам вучоных мужоў выказаць свае меркаванні па толькі што названым пытанні... *(Працягвае больш упэўнена і гучна.)* Што ёсць Біблія?

На мове старажытнагрэчаскай слова "Біблія" азначае "кніга". Так, гэта кніга, напісаная мужамі далёкіх часоў. У сей кнізе, дакладней, у многіх кнігах, што яе складаюць,— найбагацейшая крыніца разнастайных ведаў. Кніга патрэбна кожнаму, бо яна робіць чалавека мудрэйшым, а без мудрасці і добрых звычаяў немагчыма "пачтиве жити людем посполите на земле".

*У стане Скарыны ажыўленне:*

"Малайчына, Франэк!"

*У акружэнні Райхенберга чуецца гул пратэсту, Райхенберг скептычна смяецца, смяюцца і яго паплечнікі. Прафесар суцішае гул — звоніць званочкам.*

**Скарына** *(паглядзеўшы ў бок Райхенберга і яго кампаніі)*. Толькі невук і вар'ят можа ўсумніцца ў неабходнасці распаўсюджвання кнігі ў народзе. Аднак свяшчэннае пісанне гэтак жа, як і іншыя кнігі, існуе толькі на мове лацінскай, на мове царкоўна-славянскай, простым людзям незразумелай. Ці

ж маем мы права хаваць навуку ад народа? Наш абавя- зак — даць народу кнігі на роднай, блізкай яму мове.

*У зале зноў гул. Папераджальна гучыць званочак.*

**Скарына** *(натхнёна, узрушана).* Няпраўда, што нібыта толькі старажытныя мовы могуць быць моваю кніг. Мовы польская, чэшская, мова маёй радзімы Белай Русі вартыя таго, каб стаць мовамі навукі. Хіба ім не хапае слоў, ці, можа, няма ў іх правіл граматычных, як у старажытных класічных мовах? Ёсць! Толькі перакладаючы свяшчэнныя кнігі на жывую мову ўсіх народаў, можна дабіцца таго, каб яны сталі сродкам распаўсюджання навукі, асветы і культуры ў народзе. Гэта я сцвярджаю і інакш думаць не магу.

**Райхенберг** *(з месца).* Я хачу абвергнуць выказаныя схалярам Францыскам палажэнні.

**Прафесар Глагоўскі.** Добра, рыцар фон Райхенберг. Займіце месца за кафедрай.

**Райхенберг** *(ідзе да другой кафедры).* Выказаныя табой, Францыск, палажэнні — гэта награмаджэнне лжывых, ерэтычных думак, якія ганьбяць свяшчэннае пісанне.

**Скарына**. На якой падставе ты сцвярджаеш такое, Райхенберг?

**Райхенберг.** Бо ты гаворыш пра свяшчэннае пісанне, нібы пра звычайную кнігу, што напісана людзьмі. Між тым мы лічым яго боскім адкрыццём.

**Скарына.** Не, кнігі гэтыя напісаны людзьмі, і мы можам нават назваць іх імёны. А калі напісанне падказана людзям зверху, Богам, дык гэта толькі павялічвае мудрасць і навуковы сэнс пісання. Хіба ты не згодны са мной, Іаган фон Райхенберг?

**Райхенберг**. Я сцвярджаю, што гэта багахульства! А чаго варта твая прапанова аб неабходнасці перакладу свяшчэннага пісання на грубую і нікчэмную мову чэрні?

**Скарына.** На высакародную мову народа!

**Райхенберг** *(зняважліва).* Народ! Народ! Хіба нікчэмны мужыцкі зброд, падобны да дзікіх звяроў, што жыве у вашых лясах і балотах, мае патрэбу ў навуцы?

**Скарына.** Іаган фон Райхенберг! Не ў першы раз чую ад цябе гэтыя ганебныя словы. Ты забыўся, што сто гадоў назад люд маёй роднай Белай Русі разам з палякамі, чэхамі і ліцвінамі разбіў тваіх пыхлівых продкаў на полі Грунвальда. Ім далі незабыўны ўрок тыя самыя мужыкі, якіх ты так зневажаеш цяпер...

**Прафесар Глагоўскі** *(звоніць званочкам).* Вы адхіліліся ад тэмы. Дастаткова. *(Скарына і Райхенберг ідуць на свае месцы.)* Ітак, паважаныя панове, ці лічыце вы схаляра Францыска Скарыну вартым вучонай ступені бакалаўра?

*Прафесары раяцца, адабральна ўсміхаюцца, ківаюць галовамі.*

**1-ы вядучы**. Вучоная ступень бакалаўра была прысуджана Францыску Скарыне аднагалосна.

**Прафесар Глагоўскі** *(устае).*
Доміне Францішак! З асаблівым
Замілаваннем да цябе звяртаю
слова,
Ўлюблёны вучань мой.
Не крыўдзіцеся, другі,
Ён быў між вас, як месяц паміж
зорак,
Як сонца промень,— розумам
І працай, як пчала.
... Талент гэтакі зарыць —
злачынства.
У імя таго, хто даў табе твой розум,
Упартасць і ўзнёсласць дум,—
Ідзі вучыцца далей.
**Скарына.** Мне даў іх мой народ гаротны.
У імя яго
Гатоў пайсці вучыцца на край
свету.
Але куды ісці, настаўнік мой?
**Прафесар Глагоўскі.**
Ідзі ў Італію, у Падую. Між Акадэмій
свету
яна за ўсіх слаўнейшая,
Францыск.
**Скарына.** Пайду, настаўнік мой.

Міхась Клімковіч. Георгій Скарына

*Усе ідуць са сцэны. Гучыць італьянская мелодыя.*

**3-і вядучы**.
Над Падуяй неба такое наўкруг,
Як сны мастакоў Адраджэння.
Падуя — горад вялікіх навук,
Слаўных надзей і імкненняў.

Ларыса Геніюш. Скарына

**4-ы вядучы**. Неўзабаве Скарына быў ужо ў Італіі, у славутым Падуанскім універсітэце. 5 лістапада 1512 года беднаму маладому вучонаму Францыску, сыну Лукі з Полацка, русіну, было дазволена бясплатна здаць экзамен на атрыманне вучонай ступені доктара медыцыны. Экзамен працягваўся два дні.

**3-і вядучы**. Адзін з даследчыкаў прыгадвае, што ў Францыска Скарыны не хапіла сродкаў на святочнае адзенне. Усёй раскошы яго ён супрацьпаставіў бліскучы розум...

Адзінадушна Францыск Скарына быў прызнаны вартым ступені доктара медыцыны.

**4-ы вядучы.**

Вітаю паміж нас Францыска
Скарыну
Як роўнага між роўных, слаўнага
між слаўных,
Як доктара навук медычных і
мастацтваў вольных...

**3-і вядучы.**

Народу, даўшаму такога сына,
Хай будзе слава вечная паміж
другіх народаў!

Міхась Клімковіч. Георгій Скарына

**Стары** *(у залу).* Яму прапаноўвалі застацца ў Італіі, казалі, што зварот на радзіму загубіць яго талент. Скарына рашуча адмовіўся.

**Скарына** *(у залу).* Я пакінуў радзіму, каб набыць веды, неабходныя не толькі мне аднаму, але і майму народу. Не ўсё яшчэ спазнаў, але цяпер ужо можна пачаць задуманую справу — несці майму люду асвету. Час вяртацца дадому! *(Ідзе са сцэны.)*

**4-ы вядучы**.

Ужо доктар навукі пад сілу яму.
З Падуі слаўнай, з чужыны,
вязе Беларусі, народу свайму
жыццё сваё, званні і імя.

**3-і вядучы.**

Не князь і не шляхціц, без дворні
і слуг,
праз пушчы, мядзведжыя тропы
вяртаецца доктар медычных навук,
першы доктар на ўсходзе Еўропы.

Ларыса Геніюш. Скарына

**1-ы вядучы**. Але першую друкарню Францыск Скарына адкрыў не на радзіме, а ў Празе, тут у 1517 годзе ён выдаў сваю кнігу — “Псалтыр”. Невыпадкова была выбрана гэта кніга: апрача рэлігійна-культавага прызначэння, яна была, па сутнасці, першым беларускім букваром. Скарына бачыў у ёй “детям малым початок всякое доброе науки, дорослым помножение в науце”.

**2-і вядучы**.
Пасвіствае вецер, нібы акарына,
Грукоча над Прагай раскацісты
гром;
У цеснай каморцы Францішак
Скарына
Штось піша і піша гусіным пяром.
**3-і вядучы**.
Вядомы ён многім у чэшскай
сталіцы:
Ен слынны вучоны, ён доктар
навук.
“Псалтыр”, як нявеста, стаіць
на паліцы —
Ягоная гордасць, яго першадрук.

Уладзімір Скарынкін. Астральны знак Францыска

**1-ы вядучы**. У Празе былі выдадзены 22 кнігі “Бібліі” на тагачаснай беларускай мове.

Скарына палюбіў Прагу, дзе знайшоў сяброў і адзінадумцаў, але моцнае жаданне адкрыць друкарню на радзіме не давала супакаення.

**4-ы вядучы.**
І роднае слова гучыць сярод цьмы
чужынскай, як праўда трывожная:
“Не, не для долі жывёльнае мы,
а к доблесці, к праўдзе народжаны”.
**2-і вядучы**. Простым людзям ён піша,
субраццям сваім,
дарагія, разумныя словы.
Апавяшчае ўрачыста усім:
“Бог пусціў мяне ў свет з гэтай
мовай!”

Ларыса Геніюш. Скарына

**3-і вядучы**. Родная зямля ўладна клікала свайго сына.
*Звоняць званы.*
**2-і вядучы**. Сівы туман, як дым кадзільны,
Яшчэ не ахінуў палі,
Калі Францыск убачыў Вільні
Званіцы, вежы, купалы...

Уладзімір Скарынкін. Астральны знак Францыска

**1-ы вядучы**. Скарына з энтузіязмам і натхненнем узяўся за друкарскую дзейнасць. Выдаў “Апостал”, “Малую падарожную кніжыцу”. Аднак належных умоў для працы на радзіме Скарына не меў. Яго жыццё атручвалі змовы, звадкі, грашовыя крызісы, бясконцыя суды, зведаў ён нават даўгавую яму і турму...

*Выходзіць дзяўчына ў беларускім нацыянальным адзенні.*

**Дзяўчына**.

І трэба ж так! Ці ж не народу, краю
Аддаў ён і сябе, і кніг тамы,
Завошта ж лёс безлітасна карае
Пажарамі і холадам турмы?..

Алег Лойка. Скарына — каралеўскі
садоўнік на Градчанах

**1-ы вядучы**. 1529 год. Дом Маргарыты, жонкі Скарыны. Усе ідуць са сцэны.

*Уваходзіць Скарына.*

**Скарына**.

Судовы дзень!
Не будзь нам судным днём.
Трывожна ты займаешся...
Світанне
кідае стрэлы з ценямі на Вагі.
Мяшае на каромысле высокім
іх праменны жоўта-сіні бляск.
Куды ж хіснецца шаля?

Мікола Арочка. Судны дзень Скарыны

*Неасцярожным рухам Скарына скінуў кнігу (або якую іншую рэч). Ухутаная ў цёплую хустку, выходзіць Маргарыта, яна кашляе. Скарына ідзе насустрач, дапамагае ёй сесці ў крэсла.*

**Скарына**. Цябе я пабудзіў неасцярожна!

**Маргарыта**.

Не ты, а клопат наш ліхі, судовы
Трымае ў бессанні даўно наш дом.
Калі ўжо тыя скончацца суды
І перасуды?

**Скарына**.

Гаспадарскі суд,
Суд Жыгімонта сёння ўсё
разважыць.

**Маргарыта**.
Скажы, Францішак, праўду:
дзе прычына,
Што гэты матчын дом такой ліхой
Судовай калатнечай аблажылі?
Ну, проста сіл няма... *(Закашлялася.)*
**Скарына**.
Тужэе вузел
Зламыснасці, ўгрызення, вузел
бед...
Атручана паветра гаркасердзем —
Няма чым дыхаць!.. Атачэнне
змовы!
**Маргарыта.**
Ой, чуе сэрца цемру... Трэці суд!
Ды ім, судзілішчам, канца не будзе...
Адкуль на нас напасць такая?.. Не!
Ты штось хаваеш ад мяне, адводзіш
Мой боль грудзей ад нейкай
таямніцы...
Ці не з тваёй друкарні — нашы
беды?
Ты лепш прадай яе, Францішак...
Збудзь! *(Закашлялася.)*
**Скарына** *(у залу).*
Як адрачыся ад свайго дзіцяці?
Яно — маё жыццё, мой лёс...

Мікола Арочка. Судны дзень Скарыны

*Маргарыта туліцца да Скарыны, ён вядзе яе са сцэны, яна кашляе.*

**1-ы вядучы**. Жыццё Скарыны яшчэ больш ускладнілася пасля смерці яго брата Івана, дачаснай смерці любай жонкі Маргарыты. Выдаўцы, крыдыторы адвярнуліся, бо кнігі не давалі грашовага прыбытку. Кнігавыдавецкая, культурна-асветніцкая дзейнасць Скарыны не мела падтрымкі, яго не разумелі. На Скарыну глядзелі падазрона, як на ерэ- тыка. Гэта была вялікая драма беларускага гуманіста, новага чалавека, які апярэдзіў свой час...

*Гучыць журботная мелодыя.*

**Скарына**.
Адзін, як перст...
А ведама, што ў полі,—
Адзін не воін...
Дзе ж узяць
Для пільнай справы пенязеў,

фларынаў,
Літоўскіх грошаў..
Як перст адзін,
Не зразуметы краю ўладарамі.
Ну, што ім каштавала б чуць
падвысіць
Дзяржаўнасць разумення —
ўзяць пад крылле
Сваёй магутнасці маю друкарню,
Лёс кнігадруку — будучыні краю?
І мой прыватны гаркамысны лёс...

Мікола Арочка. Судны дзень Скарыны

**1-ы вядучы** *(Скарына таксама на сцэне)*. Апошнія гады жыцця Францішак Скарына жыў ў Чэхіі, быў вучоным садоўнікам чэшскага караля. Пэўна, ён любіў гэтую працу, але дрэвы, якія ён даглядаў на братняй чэшскай зямлі, шапацелі яму лістотаю маленства, матчынаю моваю, бо...

**Скарына**. ...Ад нараджэння звяры, што ходзяць у пустыні, знаюць ямы свае; птушкі, што лётаюць у паветры, ведаюць гнёзды свае; рыбы, што плаваюць у моры і ў рэках, чуюць віры свае; пчолы і ім падобныя бароняць вуллі свае, — гэтак жа і людзі, дзе нарадзіліся і ўскормлены суць па Бозе, да таго месца вялікую ласку маюць...

*Гукі званоў. Вядучыя і чытальнікі на сцэне, некаторыя сядзяць, гартаюць кнігі, іншыя стаяць. Галоўнае, каб у гэтым фінальным эпізодзе ўсё было шчыра, натуральна, як у час зацікаўленай размовы пра Скарыну. Можна і не драбніць прыведзены ніжэй тэкст паміж вядучымі, а даручыць яго аднаму з іх.*

**2-і вядучы**. З рук Скарыны ўсходняе славянства атрымала кнігу.

**1-ы вядучы**. Ён першым у гісторыі ўсходнеславянскай кнігі ўвёў інтэрвалы паміж словамі, каб лягчэй было чытаць, чырвоны радок, падзяліў тэкст на асобныя главы.

**2-і вядучы**. Скарына спрасціў царкоўнаславянскі алфавіт, распрацаваў спецыяльныя шрыфты.

**3-і вядучы**. Дарэчы, скарынаўскія шрыфты адрозніваліся выразнасцю, зручнасцю, нездарма яны з’явіліся узорам для наступных пакаленняў кнігавыдаўцоў, і не толькі беларускіх.

**4-ы вядучы**. У кнігах Скарыны мы знаходзім багатыя пазнавальным матэрыялам прадмовы і пасляслоўі, нешматслоўныя, красамоўныя, падкрэслена свецкага характару.

**2-і вядучы**. Свецкім зместам вызначаўся таксама илюстрацыйны матэрыял, у прыватнасці гравюры. Яны прываблівалі чытачоў мастацкай дасканаласцю, былі звязаны з зямнымі клопатамі народа.

*Гучаць цымбалы.*

**1-ы чытальнік**.
Гравюры Скарыны!
Ён выразаў іх
На спаконвечным
Дрэве гісторыі
Свайго народа,
Хоць мог бы падабраць
І больш падатлівы,
І больш удзячны
Матэрыял.
**2-і чытальнік**.
І выразаў ён іх
Не штыхелем-разцом,
А промнем сонца.
Промнем сваёй веры
І любові да народа.
Таму штрых кожны
Быў такі глыбокі,
Што ні агонь,
Ні забыццё,
Ні ворагі,
Ні час
Гравюраў гэтых
Знішчыць не змаглі.
**3-і чытальнік**.
І сёння
Нейкая чароўная
Жыве ў іх сіла,
Якая сляпым
Вяртае зрок,
Глухім — іх слых,
Няпомнячым — іх памяць,
А без’языкім — мову.

Максім Танк. Гравюры Скарыны

*Музыка сціхае.*

**4-ы вядучы**. Тытан эпохі Адраджэння, Францыск Скарына, засвоіўшы здабыткі заходнееўрапейскай культуры, не страціў свайго нацыянальнага аблічча. Моцнымі былі яго народныя карані. Выхадзец з беларускай сям’і, ён усс жыццё змагаўся за роўныя правы свайго народа з іншымі народамі, за адукацыю на роднай мове.

**1-ы вядучы**. Нам блізкія клопаты Францыска Скарыны пра нашу нацыянальную навуку і культуру, блізкія маральна-этычныя прынцыпы, увасобленыя ў яго спадчыне, Сугучны з нашымі днямі думкі Скарыны аб

духоўным абнаўленні чалавека, міласэрнасці, цнатлівасці, аб самаадда- ным служэнні ідэалам усеагульнага дабра, аб патрыятызме.

**2-і вядучы.** З далечы стагоддзяў Скарына нібы ўглядаецца ў нас, у наш час, адзначаны прыкметамі нацыянальнага адраджэння.

*Выходзіць Скарына.*

**Скарына**.

Я родам — з Адраджэння... І таму ж
Мяне ўзрушаюць так яго прыкметы.
Зямному свету — ці стае Асветы,
Унутранай асвечанасці душ?
Я множыў слова —- адліваў у
шрыфце,
Па полі белым сыпаў, як з сяўні.
Патрэбна ж людзям столькі дабрыні,
Святла, прачыстай праўды з
глыбіні —
Без гэтага ўсяго хто мы, скажыце?

Мікола Арочка. Судны дзень Скарыны

**Скарына**.

Скарына — я.
З народам буду.
З ім паміраць мне,
З ім і жыць!

Алег Салтук. У вянок Скарыне

*На словах “Па полі белым сыпаў, як з сяўні...” пачынае ціха гучаць мелодыя песні “Спадчына" (сл. Я. Купалы, муз. І. Лучанка), у канцы (пасля слоў “З ім і жыць!”) яна гучыць мацней. На сцэну выходзяць усе ўдзельнікі,* ***1-ы вядучы робіць крок наперад****: “Ты слаўна, зямля, што нарадзіла такога выдатнага сына свайго!”*

*Да 1-га вядучага далучаюцца 2, 3, 4-ы.*

**1, 2, 3, 4-ы вядучыя разам**: Будзь слаўна, зямля беларуская, зямля Скарыны.

*Заслона закрываецца.*

# “ЯКІ Ж ГЭТА ЦУД — СЛОВА, МОВА ТВАЯ!”

*Літаратурна-музыкальная кампазіцыя*

*Яфімава М. Б. “Які ж гэта цуд — слова, мова твая!” / М. Б. Яфімава // Бібліятэка прапануе. – 2000. - № 2. – С. 22-25.*

**1-шы вядучы:** Мы пачынаем вечарыну (ранішнік, урок), прысвечаную Тыдню беларускага пісьменства і друку. Сама назва вечарыны “Які ж гэта цуд — слова, мова твая!” (дарэчы, гэта радкі верша Аляксея Русецкага) вызначае і тэму і пафас сённяшняй нашай сустрэчы.

**2-гі вядучы:** Мы будзем гаварыць з пашанай і ўдзячнасцю пра вялікага і надзейнага сябра, які спадарожнічае нам, вучыць, духоўна ўзбагачае нас на працягу ўсяго нашага жыцця.

**1-шы вядучы:** Што гэта за сябар, няцяжка здагадацца, паслухаўшы верш “Мой сябар” Міколы Чарняўскага.

*Выходзіць чытальнік.*

**Чытальнік:**

З ім я ў працы, адпачынку,
На ўроку, перапынку.
З ім ў полі, з ім у школе,
З ім не сумна мне ніколі.
З ім вандрую я пасвеце,
З ім лятаю ў ракеце.
Чаго сам не адгадаю –
У яго я запытаю.
Ён усё на свеце знае,
Мне ва ўсім ён памагае.
З ім я гутарку вяду.
З ім нідзе не прападу...

**2-гі вядучы** *(усміхаецца)*:
Хто ж ён гэтакі - скажыце!
Нам яго вы пакажыце!...

**1-шы вядучы:** Сябар гэты...

Усе прысутныя: кніга!

**2-гі вядучы:** Так, кніга! Кнігі - гэта дзіва з дзівосаў. Дзякуючы ім можна трапіць у любую гістарычную эпоху, краіну свету, у самую фантастычную казку.

**1-шы вядучы:** Можна трапіць у які хочаш беларускі запаведнік, і ў далёкія джунглі, пабываць і ў космасе, і пад вадой, стаць удзельнікамі незвычайных прыгод, падарожжаў.

**2-гі вядучы:** Кнігі вядуць нас у неабдымна багаты свет ведаў; у іх мы знаходзім адказы на шматлікія пытанні, падтрымку, парады, эстэтычную асалоду. За гэта і любім мы кнігі.

*Выходзяць чатыры чытальнікі.*

**1-шы чытальнік:**
Я добрую кнігу,
Як цуда, люблю.
Яна асвятляе
Людзей і зямлю.
**2-гі чытальнік:**
На кожнай старонцы
Адкрыю сакрэт.
Там вэтразь пад сонцам,
Таемны сусвет.
**3-ці чытальнік:**
З табою, кніга добрая,
Ідзём у новы век.
Ты мудрая і шчодрая,
Як добры чалавек!
**4-ты чытальнік:**
З табой пачынае
Дарогу герой,
Ён прагна чытае,
Сябруе з табой.
**1-шы чытальнік:**
Я добрую кнігу,
Як цуда, люблю.
Яна асвятляе
Людзей і зямлю.
*Урывак з верша Э. Агняцвет “З табою, кніга добрая”.*

**1-шы вядучы** *(падыходзіць да стэнда з кнігамі)*: Кнігі! Яны такія розныя і па фармату, і па афармленню, па тэматыцы, мове. Кнігі, кнігі!.. У бібліятэках, кіёсках, у кожным доме. У нас ёсць спецыялізаваныя кніжныя крамы.

Як называецца крама, у якой прадаюцца кііігі?

**Вучні:** Кнігарня!

**2-гі вядучы:** А дом, дзе кнігі друкуюцца?

**Дзеці:** Друкарня!

**1-шы вядучы:** Так, друкарня. Увесь працэс вырабу кнігі цяпер механізаваны. А ў даўнія-даўнія часы кнігі перапісваліся ад рукі! Такое ў наш час і ўявіць цяжка. Перапісванне кніг - справа вельмі складаная, карпатлівая. Звычайна займаліся ёю манахі пры царквах, манастырах.

**2-гі вядучы:** Рабілі яны гэта з вялікім стараннем, адказнасцю і любоўю. Паслухаем верш Максіма Багдановіча “Перапісчык" і паспрабуем уявіць таго самаадданага перапісчыка, які, ізаляваўшы сябе ад навакольнага свету, у цеснай келлі з вузенькім акенцам, прыгожа выводзіў гусіным пяром літару за літарай.

*Гучыць муэыка. Выходзяць два чыталыіікі.*

**1-шы чытальнік:**
На чыстым аркушы,
прад вузенькім акном,
Прыгожа літары выводзіць ён пяром...
Парой ён спыніцца,
каб лепей завайстрыць
Пяро гусінае, і гляне: светла сонца
Стаўпамі падае праз вузкае аконца,
І круціцца ў іх прыгожы лёгкі пыл;
Як сіпяваты дым нявідзімых кадзіл,
Рой хмарачак плыве; шырокімі кругамі
У небе ластаўкі шыбуюць пад крыжамі,
**2-гі чытальнік:**
Як жар гарашчымі, а тут, каля акна,
Малінаўка пяе, і стукае жаўна.
І зноў ён схіліцца, застаўку зноў выводзіць
Няяркім серабром; нячутна дзень праходзіць;
Ужо хутка будзе ноч, і першая звязда
Благаславіць канец прыгожага труда.
*(Тэкст верша скарочаны)*

**1-шы вядучы:** Перапісванне кніг гусіным пяром - толькі адзін з этапаў развіцця пісьменства. Тысячагоддзі спатрэбіліся, каб прыйшла да нас кніга - зручная, прыгожая, выдадзеная вялікімі тыражамі.

**2-гі вядучы:** Малюнкі, умоўныя знакі, літары ў даўнія-даўнія часы высякалі на камянях, скалах, выводзілі завостранай палачкай па гліняных таблічках. “Уявіце - гліняная кніга!.. Ці ўлезла б яна ў школьны ранец? А якім трэба было б быць волатам, каб насіць яе!” - жартуе пісьменнік Уладзімір Ліпскі.

**1-шы вядучы:** Нашы далёкія продкі пісалі на бяросце, на пергаменце - так называлася спецыяльна апрацаваная скура цяляці.

**2-гі вядучы:** У Афрыцы і Егіпце выкарыстоўвалі для пісьма расліну папірус. У Кітаі пісалі на шоўку. У другім стагоддзі нашай эры ў Кітаі вырабілі паперу. Яна не адразу распаўсюдзілася ў іншых народаў.

**1-шы вядучы:** У якасці прылады для пісьма ў розныя часы выкарыстоўваліся зубіла, разец, завостраная палачка, гусінае пяро, і ўрэшце былі вынайдзены шрыфты для друкавання кніг.

**2-гі вядучы:** Хто ж першы падрукаваў кнігу па-беларуску? Хто з’яўляецца заснавальнікам беларускага кнігадрукавання?

**Вучні:** Францыск Скарына!

**1-шы вядучы:** Давайце з гонарам і ўдзячнасцю яшчэ раз паўторым гэтае імя.

**Вядучыя і вучні:** Францыск Скарына!

**2-гі вядучы:** Вось партрэт гэтага нашага сусветна вядомага земляка “са слаўнага горада Полацка”.

*Гучыць музыка. Выходзяць два чытальнікі.*

**1-шы чытальнік:**

Яшчэ ў дні старыя, у век наш лучынны
Аб горадзе Полацку слава ішла,
Друкар там выдатны Георгій Скарына,
Што зоры рассыпаў на роднай краіне
Крыштальныя словы навукі-святла.

**2-гі чытальнік:**

Нямала народаў з крыніц яго піла,
І брала ад мудрасці вечны агонь,
У літарах першых знаходзячы сілу.

**1-ы чытальнік:**

Ты слаўна, зямля, што вякам нарадзіла

**1-шы і 2-гі чытальнікі:**

Такога выдатнага сына свайго!

*Пятрусь Броўка "Беларусь" (урывак)*

**1-шы вядучы:** Нарадзіўся Францыск Скарыца, як сведчаць даследчыкі, 6 сакавіка 1486 года ў сям'і полацкага купца. Рос ён дапытлівым, цікаўным, змалку цягнуўся да кнігі, ведаў.

**2-гі вядучы:** Бацька хацеў, каб сын яго таксама стаў купцом, але Францыск выбраў іншы шлях... Вось як пра гэта распавядае ў сваёй драматычнай паэме "Георгій Скарына" Міхась Клімковіч...

**1-шы вядучы:** Вы спытаеце, чаму Георгій Скарына, калі ў гэтым творы Міхася Клімковіча ідзе размова пра Францыска Скарыну?

**2-гі вядучы:** Адкажам: імя Георгій ніколі не было ў нашага слаўнага вучонага, першадрукара Францыска Скарыны. Гэта памылка даследчыкаў, якая праіснавала даволі доўга і таму, зразумела, замацавалася ў некаторых творах нашай літаратуры, што былі напісаны раней.

**1-шы вядучы:** Глядзіце ўрывак з драматычнай паэмы Міхася Клімковіча.

*Удзельнічаюць: бацька Францыска Скарыны - Лукаш, Скарына (ролю выкон-вае...), Францыск Скарына (ролю выконвае...).*

*Вядучыя ідуць са сцэны. Гучыць гон. Выходзяць выканаўцы ўрыўка з гэтага твора - бацька і сын. Бацька садзіцца, сын, утаропіўшы вочы ў падлогу, стаіць непадалёк*

**Георгій** *(узнімаючы галаву)*:

Я, бацька, гаварыў, што я люблю цябе.
Што ты - жыцце маё... Але...
Бацька, я гандляваць не буду.
Няхай Іван, напапалам з Раманам,
Бярэ маю часціну. Я пайду
У свет вучыцца.

**Бацька:**

Георгій, не жартуй! Ты ведаеш,

Што я сказаў, то з камня высек.
**Георгій:**
Бацька, я Скарына таксама, я не гнуся
Ні пад чыёй рукой.
**Бацька:**
Я і зламаць магу...
**Георгій:**
Не зломіш, бацька!
**Бацька** *(зазлаваў)*:
У манастыр аддам, у паслушнікі!
**Георгій:**
Хіба, што мёртвага,
Жывы й адтуль збягу.
**Бацька:**
У жалеза закаваць вялю...
**Георгій:**
Перагрызу зубамі!..
*(Пасля паўзы. Цвёрда, але больш лагодна)*
Тату! Дазволь мне на чаўне маім, на новым,
Паставіць ветразі, каб мне даплыць туды,
Куды ты сам баішся, што не трапіш.
Для чалавека ветразь - веды.
Па веды я пайду няхай сабе й на захад.
Вярнуся з імі я к свайму народу...
**Бацька:**
Не разумееш ты па маладосці,
На што ідзеш:
На холад, голад...
А мо й па смерць.
**Георгій:**
Я малады, я дужы, бацька!
Я праб'юся!
Смерць абыйду!
**Бацька** *(пасля паўзы)*: Тады... ідзі!
**Георгій:** *(кінуўся на калені)* Благаславі!
**Бацька:**
Благаслаўляю -
У імя айца і сына, і святога духа... *(перахрысціў сына)*.
*Бацька ідзе са сцэны. Сын падымаецца. Стаіць задуменны.*
**Георгій:** Радзіма, я пакінуў сам свае лясы,
Палі, гарады і сёлы...
Пайшоў шукаць я для цябе
Святло навукі!

*С. Шушкевіч*
*“Скарына ў Празе” (урывак)*

*Францыск Скарына ідзе са сцэны*

**1-шы вядучы:** Шмат краін пабачыў Францыск Скарына. Вучыўся ў Кракаўскім універсітэце, дзе атрымаў вучоную ступень бакалаўра філасофіі. Працаваў і вучыўся ў Заходняй Еўропе.

**2-гі вядучы:** У 1512 годзс ў Італіі ў славутым Падуанскім упіверсітэце Скарына бліскуча абараніў дыплом на званне доктара медыцыны.

**1-шы вядучы:** Меў Францыск Скарына таксама ступень доктара свабодных навук. Гэта быў высокаадукаваны, інтэлігентны чалавек, вучоны-гуманіст, асветнік-дэмакрат, пісьменнік, перакладчык, паэт, філосаф - надзвычай яркая і markазнабаковая творчая асоба.

**2- гі вядучы:** Скарына быў пачынальнікам шмат якіх галін беларускай культуры, навукі, мастацтва, літаратуры. І ўсюды сказаў сваё важкае слова.

**1-шы вядучы:** Ён быў адданым сынам зямлі, на якой нарадзіўся, народа свайго, з якім усё жыццё звязвалі яго глыбокія і моцныя карані.

**2-гі вядучы:** Свае кнігі Францыск Скарына выдаваў на зразумелай простаму народу мове. Перакладаючы “святыя кнігі", ён знарок замяняў незразумелыя архаічныя словы тымі, якія браў з жывой тагачаснай беларускай мовы (праца, клопат, помста, прыгожнй, лепшнй, горший і інш.)

**1-шы вядучы:** Першую сваю кнігу “Псалтыр” Францыск Скарына выдаў у Празе ў 1517 годзе, з яе вядзе пачатак беларускае кнігадрукаванне.

2-гі вядучы: 3 рук Скарыны кнігу ат-рымала ў 1517 годзе - усё усходняе сла-вянства. Запомніце гэту дату - 1517 Год!

**1-шы вядучы:** Першым у гісторыі ўсходнеславянскага кнігадрукавання Скарына ўвёў чырвоны радок, інтэрвалы між словамі. Уяўляеце, як цяжка было б чытаць кнігі, калі б у іх тэксты друкаваліся суцэлыіымі радкамі? Скарына падзяліў тэкст і на асобныя главы.

**2-гі вядучы:** Наш першадрукар Скарына спрасціў царкоўнаславянскі алфавіт, распрацаваў спецыяльныя шрыфты!

**1-шы вядучы:** Скарынаўскія шрыфты адрозніваліся выразнасцю, зручнасшо, нездарма яны былі ўзяты за ўзор наступнымі пакаленнямі кнігавыдаўцоў, і не толькі беларускіх!

**2-гі вядучы:** Дбаў Скарына і пра знештіі выгляд, пра мастацкае афармленне сваіх кніг. Вядомы сучасны беларускі даследчык Вячаслаў Чамярыцкі назваў іх сапраўдным узорам друкарскага майстэрства. “Скарынаўская кніга, - піша ён, - і сёння здзіўляе і цікавіць нас. А з якім незвычайным пачуццём браў яс ў рукі чытач XVI стагоддзя?! Яна радавала і вабіла па-майстэрску выкананымі свецкімі гравюрамі, застаўкамі, ініцыяламі з тонкім густам размешчатіым тэкстам... Яна радавала і вабіла сваёй прастатой і зручнасцю, шчырасцю і даверлівасцю размовы, якую вёў з чытачом у сваіх прадмовах першадрукар”.

*Гучыць музыка.*

*1-га і 2-га вядучых змяняюць 3-ЦІ і 4-ты.*

**3-ці вядучы:** Нас хвалююць клопаты Францыска Скарыпы пра нашу нацыянальную культуру і навуку, пра нашу мову.

**4-ты вядучы:** Нам блізкія маральна-этычныя прынцыпы, увасобленыя ў яго спадчыне. Яго думкі аб духоўным абнаўленні чалавека, міласэрнасці, цпатлівасці, аб самаадданым служэнні ідэалам усеагульнага дабра, аб патрыятызме.

**3-ці вядучы:** Мы ганарымся той вышынёй духоўнасці і навукі, наякую ўзняўся наш зямляк Францыск Скарына, тытан эпохі Адраджэння "са слаўнага горада Полацка".

**4-ты вядучы:** "Францыск Скарына, - пісаў Упадзімір Караткевіч, - быў з тых, першых, хто, кажучы сучаснымі словамі, стварыў стартавуга пляцоўку для рыўка чалавецтва ў ягоную неабсяжную будучыню. Чутны і нам праз сгагоддзі стук яго друкарскага станка".

*Гучыць музыка. Выходзіць чытальнік.*

**Чытальнік:**

Сусветную славу яму здабылі
Кнігі, якія жывуць у стагоддзях.
Першадрукар беларускай зямлі
І слова народнага першапраходзец.
Роднае слова адчуў ён душой,
Яно асвяціла і думкі, і сэрца.
Маладзіком над зямлёй ўзышоў,
Якая спрадвек Беларуссю завецца.
Схіляўся над кнігамі, як чарадзей,
Іх выдаў у Вільні і ў Празе нямала.
Кніжную мудрасць ён нёс для людзей,
Каб мудрасці гэтай святло не згасала!
Слава Францыска не ведае меж,
Птушкай яна абляцела краіны.
Новую кнігу ты ў рукі бярэш -
І адгукаецца рэхам: Скарына.

Юрась Свірка

**3-ці вядучы:** Пачатую Скарынам друкарскую справу гожа прадоўжылі выдатныя беларускія кнігадрукары С. Будны, В. Цяпінскі, Л. Зізаній, Мамонічы і іншыя.

**4-ты вядучы:** І ўсё ж належных умоў для развіцця друкарскай справы Беларусь доўга не мела, бо пад забарону (па стагоддзі!) трапіла само беларускае слова, бо нават назва нашай роднай старонкі - Беларусь - была закрэслена, заменена іншай - афіцыйнай, халоднай, нацыянальна безаблічнай - Северо-Западный край.

**3-ці вядучы:** Беларусы не мелі магчымасці вучыць сваіх дзетак па роднай мове, мець беларускую кніжку...

**4-ты вядучы:** З гэтым нельга было змірыцца. За роўныя правы свайго народа з інніымі народамі, за родную мову і адукацыю на ёй, за права “людзьмі звацца” змагаліся адданыя сыны і дочкі нашай Бацькаўшчыны.

**3-ці вядучы:** Успомнім некаторыя імены: Дунін-Марцінкевіч, Францішак Багушэвіч, Кастусь Каліноўскі, Цётка, Алесь Гарун, Вацлаў Ластоўскі, Максім Гарэцкі, Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч. Ды хіба назавеш усіх?

**4-ты вядучы:** Прыкметна ажывілася беларускае кнігадрукаванне на пачатку XX стагоддзя.

**3-ці вядучы:** Асабліва актыўна імкліваму, дзейснаму, бурнаму развіццю беларускага друку, мовы, нацыянальнай адукацыі, культуры садзейнічала Кастрычніцкая рэвалюцыя. Актывізаваліся нацыянальыіыя сілы, кадры Беларусі. Хваля нацыянальыіага адраджэння была ў 20-я гг. магутнай, светлай, яна поўніла сэрцы беларусаў надзеямі, непадробнай радасцю.

**4-ты вядучы:** Пачало выходзіць шмаг газет, часопісаў; ствараліся літаратурна-мастацкія арганізацыі, кожная з іх, а таксама іх філіі ў правіцыі, мелі свой друкаваны орган. Было наладжана сістэматычнае выданне беларускіх падручнікаў мастацкіх кніг.

**3-ці вядучы:** Было створана Беларускае дзяржаўнае выдавецтва, паладзіліся творчыя сувязі з літаратурамі іншых народаў Савецкага Саюза, актыўна развівалася перакладчыцкая дзейнасць. Творы беларускіх аўтараў загучалі на многіх мовах.

**4-ты вядучы:** Але ў гісторыі беларускага друку, у лёсе нашай мовы было нямала драматычнага. У выніку парушэння правоў чалавека і законнасці шмат беларускіх кніг было забаронена, знішчана, загінулі таленавітыя творцы. Зараз яны рэабілітаваны, але...

*Выходзіць чытальнік. Гучыць музыка.*

**Чытальнік:**

Страчана...
Страчана...
Страчана...
Надпіс на кожным цэтліку
З памяццюспячаю спадчыпу
Не зберaглі мы цэлаю...

*З-ці і 4-ты вядучыя змяняюць 1-га і 2-га.*

**1-шы вядучы:** Сёння на Беларусі працуе некалькі выдавецтваў, сярод іх - “Мастацкая літаратура”, “Беларусь", “Вышэйшая школа”, “Полымя", “Народная асвета”, “Бсларускі кнігазбор", “Беларуская энцыклапедыя", “Юнацтва" і іншыя.

**2-гі вядучы:** Працуюць і прыватныя выдавецтвы. Беларускія кнігі за высокую якасць паліграфіі і мастацкае афармленне нярэдка адзначаюцца ганаровымі дыпломамі.

**1-ы вядучы:** Аўтарытэт беларускай кнігі, сучаснай беларускай літаратуры высокі. Шмат у нас таленавітых, арыгіналыііых, нацыяналыіа адметных майстроў слова..

Выдаюцца новыя беларускія чаеопісы, газеты... І ўсё ж...

**2-гі вядучы:** І ўсё ж не сціхае трывога за роднае слова, за лёс беларускай мовы. Усё больш звужаецца сфера яе ўжытку, усё менш беларускіх школ...

**1-ы вядучы:** Як жа абкрадае сябе той, хто цураецца роднага слова, як збядняе ён свой духоўны свет...

**Чытальнік:**

Страціў слова, страціў спадчынае слова -
Штосьці страціў у душы абавязкова!
Можа — годнасці хоць кропельку малую?
Можа - мудрасці хоць дробачку якую?
Можа - памяці хоць зернятка-іскрынку?
Можа - праўды хоць пылінку-парушынку?
Я не ведаю дакладна, што ты страціў.
Запытайся - ці не скажа табе маці...

Ніл Гілевіч.

**2-гі вядучы:** А “якая яна невычэрпная, багатая, самабытная, сакавітая, і мілагучная наша родная беларуская мова! - піша народны паэт Беларусі Ніл Гілевіч. - У ёй закладзена здароўя і жыццёвай сілы на многія тысячы гадоў, яна можа і павінна дарыць чалавецтву паэтычныя тварэнні, роўныя найвялікшым у свеце”.

**1-шы вядучы:** Мы прапапуем вянок, сплецены з вершаў, якія беларускія паэты прысвяцілі роднай мове.

**2-гі вядучы:** Слухайце і сэрцам адчуйце звабнасць, сілу, спеўнасць роднага слова.

*Вядучыя ідуць са сцэны. Гучыць музыка, адзін за другім выходзяць чытальнікі: першы, скончыўшы чытанне, застаецца на сцэне, гэтаксама і наступныя. Усе вершы гучаць у музычным суправаджэнні.*

**1-шы чытальнік:**

Мова...
Родная мова
У марах, у песнях, снах.
Мае ў ёй кожнае слова
Свон колер, і смак, і пах.
Зліваюцца гукі ў словы
1 ў рэчышча роднай мовы,
Як рэкі ў мора, цякуць.
І думкі мае плывуць
На хвалях і дзён, і начэй
Да сэрцаў людскіх і вачэй.

Анатоль Грачанікаў

**2-гі чытальнік:**
Слова!
Цуд найвялікшы між цудаў-дзівосаў,
Што здзіўляў у вяках і здзіўляе панова.
'Грапяткое,
жывое,
як промень у росах, -
Несмяротнае, роднае матчына слова!
Слова ў вуснах і ў кнізе, на медзі скрыжаляў,
На харугве святой,
на пліце мармуровай
Слова
крыўды і гневу, пяшчоты і жалю -
Любай Маці-Радзімы вячыстае слова.

Ніл Гілевіч

**3-ці чытальнік:**
Чую тваю жаўруковую музыку
У скошаных травах мурожных.
Мова! Як сонца маё беларускае
Ты свецішся словам кожным.
Цябе і заворвалі і закопвалі.
І ўсё ж нашы продкі праз гора
Данеслі да нас цябе, родную, цёплую,
Жывую і непаўторную.
І калі ты мяне толькі паклікаеш,
Памру за цябе без енку.
Нашу я любоў да цябе вялікую
У сэрцы сваім маленькім.

Яўгенія Янішчыц

**4-ты чытальнік:**
Адкрываю,
як свет,
нанова
беларускае
роднае слова,
пералівістае –
як праменьчык,
вясёлкавае –
як ручэй,
цёплае –
як агеньчык
добрых тваіх вачэй,
светлае –

як маланка,
гнеўнае –
як пярун,
ціхае –
як калыханка,
вечнае –
як Беларусь!

Анатоль Канапелька

**5-ты чытальнік:**
Гавары роднай
Мовай сваёй,
Прыгажэй
За пялёсткаў вішнёвых.
Што крыштальнай
Сваёй чысцінёй
Выпраменьвае
З ласкаю слова.
Гавары роднай
Мовай сваёй,
Што гадамі
Ніпто не скрышыла.
Таму наканавана ёй
На вякі –
Неўміручая сіла

Мар'ян Дзеружынскі

**6-ты чытальнік:**
Мова мая!
Ты - як хлеб святы.
Святою
І будзеш заўсёды.

Таіса Мельчанка

**7-мы чытальнік:**
Прад табой старонкі кніг
З мілым, любым, родным словам,
Там бруіцца наша мова –
Мова прадзедаў тваіх.
Кніга ж мудрасці глыток,
Палюбі яе спачатку,
І засвоіш ты, дзіцятка,
Што яна - да ведаў крок.

Кастусь Жук

*Выходзяць на сцэну ўсе ўдзельнікі вечарыны.*

**1-шы вядучы:**
Ускінь цікаўнасці рукзак,
Абуй цярпепня кеды,
Будзі няўрымснасці бальшак –
*Усе чытальнікі разам:*
- Ідзі ў Краіну Ведаў!
**2-гі вядучы:**
Усё, што да цябе,
Засвой,
Ты -
З племя непаседаў.
Суроч
Красою позірк свой,
*Усе чытальнікі разам:*
Кроч
у Краіну Ведаў!..
**1-шы вядучы:**
Хай вечна вядзе вас наперад
І грэе вам сэрцы нясноварыяла
Святая, нязгасная вера
У наша бяссмертнае Слова!

Ніл Гілевіч

*Выконваецца або гучыць у запісе беларуская песня.*

**Ад складальніка:** У прапанаваны сцэнар, безумоўна, могуць быць унесены змены: скарачэнні, перастаноўка і замена некаторых твораў, змяненне колькасці ўдзелыіікаў, увядзенне новых дзеючых асоб (напрыклад, Кніжніка Усеведа), можна таксама перадаць тэкст вядучых настаўніку, правесці нетолькі вечарыну, але і ранішнік або святочны інсцэніраваны ўрок.

Зазначым яшчэ, што хоць гэты сцэнар напісаны да 'Гыдня беларускага пісьменства і друку, яго матэрыял можа быць выкарыстаны настаўнікамі, бібліятэкарамі і ў слове да Дня ведаў, які адзначаецца, як вядома, 1-га верасня.

# ФРАНЦЫСК СКАРЫНА — ПЕРШАДРУКАР, АСВЕТНІК, ГУМАНІСТ

*Вусны часопіс*

*Мілянтынава Т. Францыск Скарына — першадрукар, асветнік, гуманіст / Т. Мілянтынава, Ж. Ладзята // Бібліятэка прапануе. – 2017. - № 3. – С. 2-6.*

*“Ніякай працы і скарбаў ніякіх*
*не шкадуйце для паспалітай*
*карысці для айчыны сваёй”.*
*Францыск Скарына*

**Расказчык 1.** Першыя кнігі на беларускіх землях былі рукапісныя. Традыцыі рукапіснай кніжнасці склаліся на тэрыторыі нашай Радзімы яшчэ ў перыяд, які папярэднічаў мангольскім нашэсцям. Прыкладам з’яўляецца полацкая князёўна Еўфрасіння, якая ў XI стагоддзі займалася перапісваннем і распаўсюджваннем царкоўных кніг. Пры багатых манастырах у гарадах Полацку, Пінску, Мінску, Брэсце, Навагрудку ўзнікалі цэнтры беларускага кніжнага пісьменства. Гэтыя цэнтры пакінулі нам выдатныя помнікі рукапіснага пісьма на пергаменце: Тураўскае евангелле XI стагоддзя, а таксама Псалтыр 1296 года. Толькі ў XIV стагоддзі разам з пергаментам у рукапіснай справе стала выкарыстоўвацца папера. Праца пісцоў была цяжкай і стамляючай. З ранку да вечара манах мог перапісаць усяго дзветры старонкі. Ёсць кнігі, якія перапісваліся гадамі. Асноўным сродкам пісьма было гусінае пяро, завострыванне якога патрабавала асаблівай увагі. (Выкарыстанне інтэрактыўнай дошкі.)

**Расказчык 2.** Яшчэ ў VIII стагоддзі ў Кітаі і Карэі быў вынайдзены самы ранні спосаб кнігадрукавання — атрыманне адбіткаў з цэльнай гравіраванай драўлянай формы. Там жа ў XI стагоддзі былі зроблены першыя спробы кнігадрукавання з выкарыстаннем набарнага шрыфту. І толькі ў XV стагоддзі першыя падобныя выданні з’явіліся ў Еўропе.

Вынаходнікам кнігадрукавання з выкарыстаннем наборнага шрыфту лічыцца немец Іаган Гутэнберг. Гэты перыяд увайшоў у гісторыю як Адраджэнне, росквіт мастацтваў, навукі і новых тэхналогій, а таксама пачатак эпохі кнігадрукавання, калі было надрукавана ў Еўропе прыкладна 20 мільёнаў кніг, частка якіх была завезена ў Вялікае Княства Літоўскае. Аднак гэта не магло задаволіць попыт на кнігі. Пазней працэс распаўсюджвання еўрапейскага кнігадрукавання пашырыўся на славянскія краіны. Першыя славянскія друкарні з’явіліся ў Чэшскім каралеўстве — адной з найбольш развітых дзяржаў Цэнтральнай Еўропы.

**Бібліятэкар**. 1517 год — пачатак эпохі беларускага кнігадрукавання, што звязана з дзейнасцю беларускага і ўсходнеславянскага першадрукара, асветніка-гуманіста, пісьменніка, грамадскага дзеяча, прадпрымальніка, вучонага-медыка Францыска Скарыны (каля 1490-1551 гг.). Ён першы праспяваў гімн беларускай мове, пераканаў чытачоў у яе грамадскай і духоўнай каштоўнасці. У гэтым годзе мы святкуем 500-годдзе вялікай даты, якая змяніла свет.

**Расказчык 1**. У сувязі з недахопам верагодных крыніц біяграфія Францыска Скарыны вядома слаба. У гістарычнай літаратуры, летапісах і хроніках галоўная ўвага ўдзялялася палітычным і царкоўным падзеям, подзвігам вялікіх князёў, феадальнай знаці. Творчасць дзеячаў культуры рэдка цікавіла беларускіх і літоўскіх летапісцаў, прафесійных гісторыкаў. З пункту іх гледжання, апісваць дзейнасць кнігавыдаўцоў, друкароў з’яўлялася гэтак жа дзіўным, як, напрыклад, маляваць на карцінах, вышываць на габеленах штодзённую працу рамесніка або селяніна. Даследчыкі лічаць, што прозвішча “Скарына" ўтварылася ад старажытнага слова “скора” (скура), або “скоріна” (скарынка) — цвёрды вонкавы слой хлеба. (У Полацку з даўнейшых часоў было распаўсюджана гарбарна-шавецкае рамяство, што абумовіла ўзнікненне падобных прозвішчаў.)

Дзяцінства Скарыны прайшло ў Полацку, у горадзе з даўнімі культурнымі, кніжна-літаратурнымі і пісьмовымі традыцыямі, царкоўнымі і свецкімі школамі, дзе з часоў хрышчэння Кіеўскай Русі развівалася кнігапісанне. У часы Скарыны ўсе полацкія храмы і манастыры мелі кніжныя зборы. Тут, у Полацку, у Сафійскім саборы знаходзілася найбуйнейшая бібліятэка Беларусі таго часу. Паводле меркаванняў многіх даследчыкаў, Скарына атрымаў адукацыю ў бернардзінскім манастыры.

**Расказчык 2**. Прыкладна ў 1504 годзе ён паступіў вучыцца ў Кракаўскі ўніверсітэт на факультэт свабодных мастацтваў або філасофіі. Жыццё студэнтаў было суровым і аднастайным. Панавалі амаль манастырскія правілы: строгая рэгламентацыя заняткаў, вучэбнага і вольнага часу. Асновай усяго працэсу навучання было вывучэнне твораў Арыстоцеля, Цыцэрона, Вергілія, Платона. Многія магістры, прафесары Кракаўскага ўніверсітэта распаўсюджвалі ідэі Адраджэння, рацыяналізму, свец- кай гуманістычнай культуры. У Кракаве Скарына непасрэдна пазнаёміўся з друкаванымі вучэбнымі кнігамі і, магчыма, з якой-небудзь мясцовай друкарняй, усвядоміўшы навучальныя і асветніцкія магчымасці друкаванай кнігі. Праз два гады Скарына вытрымаў экзамен на ступень бакалаўра. Не пазней восені 1512 года ён прыязджае ў невялікі горад Італіі Падую — важны цэнтр італьянскай культуры, гуманізму і Адраджэння — і паступае ў Падуанскі ўніверсітэт, дзе бліскуча вытрымлівае экзамен на ступень доктара медыцыны.

**Бібліятэкар**. Пасля 1512 года ў жыцці Скарыны надыходзіць адзін з найбольш значных пераломных перыядаў. Менавіта ў гэты час (1513-1516

гг.) Скарына вырашыў пачаць кнігадрукаванне. Безумоўна, у гэтых намерах яго падтрымлівалі землякі з Вільні, Полацка, беларускія купцы. Не пазней 1516 года ён асталяваўся ў Празе і пачаў інтэнсіўную выдавецкую дзейнасць. На сродкі віленскіх мецэнатаў Багдана Онкава і Якуба Бабіча Скарына абсталяваў друкарню, заказаў шрыфты, гравюры і іншыя ўпрыгожанні і пачаў друкаваць свой пераклад Бібліі.

Біблія — зборнік твораў старажытнага пісьменства, Святая кніга іўдзейскай і хрысціянскай рэлігій, складалася на працягу першага тысячагоддзя да нашай эры — другога стагоддзя нашай эры на тэрыторыі Палесціны (старажытнае Ізраільска-Іўдзейскае царства) на арамейскай, старажытна-яўрэйскай і старажытна-грэчаскай мовах. Поўная Біблія складаецца з двух частак — Старога запавету (50 кніг) і Новага запавету (27 кніг). Слова “Запавет" азначае запавет Бога выбранаму народу (старажытным яўрэям), а праз яго — усяму чалавецтву.

Біблейскія тэксты пачалі распаўсюджвацца ва ўсходнеславянскіх землях з часоў прыняцця хрысціянства ў Кіеўскай Русі (X-XI стагоддзі). Адпаведна з той роллю, якую адыгрывала рэлігія ў духоўным, грамадскім сацыяльна-палітычным жыцці сярэдневяковай Еўропы, Біблія займала асаблівае месца ў рукапіснай пісьменнасці і кнігадрукаванні XV — XVI стагоддзяў. На Біблію абапіралася ўся дагматыка хрысціянскай царквы, яна ўплывала на нормы паўсядзённага жыцця. “Біблія — дзівосная рака! Яна бывае мелкай, што нават авечка можа перайсці яе, але адначасна і глыбокай, калі і слон змушаны плысці цераз яе!

У гэтай кнізе — пачатак і канец усёй існай мудрасці! Толькі праз яе можна спасцігнуць Бога-Уладара! У гэтай кнізе — усе законы і правы, якімі карыстаюцца людзі ў зямным жыцці! У гэтай кнізе ўсе лекі душэўныя і цялесныя разам знойдзеце!” Гэта словы самога Францыска Скарыны.

**Расказчык 1.** Скарына выдаў 23 ілюстраваныя кнігі Старога Запавету агульным аб’ёмам каля 1200 аркушаў пад агульнай назвай “Біблія руска, выложена доктором Франціском Скоріною со славного града Полоцка, Богу ко чті і людям посполітым к доброму наученію”. Гэта было ўнікальнае выданне на мове, блізкай да тагачаснай беларускай літаратурнай мовы. Пранікненне беларускай мовы ў кнігі Свяшчэннага пісання выяўляла яе неабмежаваныя магчымасці ва ўсіх сферах духоўнага жыцця, літаратуры, пісьменства, ставіла беларускую мову нараўне з еўрапейскімі.

Выдавецкая творчасць Скарыны нават знешне ўяўляла сабою сімвал новага. Перакладчык, каментатар і друкар Бібліі надаў пры ёй свой партрэт на фоне атрыбутаў вучонага (сфера, ліхтар і пчала) і кніг — з’ява для таго часу ўнікальная. Навіна была ў малюнку шрыфту, у аздобе — пераважна чорна-белыя гравіраваныя ілюстрацыі (замест звыклых каляровых заставак і шматколерных мініяцюр), якія выконваліся прадстаўнікамі розных мастацкіх школ пры ўдзеле самога Скарыны, адмысловы тытульны аркуш.

Паказ партрэта Скарыны і першага выдання Бібліі, тытульных лістоў да асобных раздзелаў на інтэрактыўнай дошцы.

Напісаныя Скарынам 50 прадмоў і 62 пасляслоўі да сваіх кніг з'яўляюцца першым у Беларусі каментарыем да Бібліі, дзе тлумачыцца паходжанне кожнай з апублікаваных, іх аўтарства і значэнне. Каб пазбегнуць спрошчанага, памылковага ўспрыняцця Бібліі, перад кожным раздзелам біблейскіх кніг перакладчык і выдавец змясціў кароткія анатацыі, уякіх сцісла вызначаны змест адпаведнай часткі кнігі.

Кнігі Скарыны вылучаліся выдавецкімі і друкарскімі якасцямі высокага еўрапейскага ўзроўню і былі арыентаваны на ўсе пласты беларускага насельніцтва: для сямейнага чытання, выкарыстання ў царкоўных службах і свецкіх бібліятэках.

**Расказчык 2.** Друкарскі станок— масіўнае драўлянае збудаванне — замацоўвалі дзве вертыкальныя бакавыя апоры з папярочнымі перакладзінамі. Друкаванне патрабавала значных намаганняў майстра, таму апоры мацаваліся і да столі, і да падлогі. На выраб друкарскага станка 16 стагоддзя ішло каля 30 пудоў (480 кг) дубовай драўніны, 7-9 пудоў медзі і жалеза. Кошт друкарскага станка таго часу быў вельмі высокім і патрабаваў вялікіх фінансавых укладанняў.

Цяжкай справай было набыццё паперы для кнігадрукавання. У канцы XV — пачатку XVI стагоддзя папера не выраблялася яшчэ ні ў Польшчы, ні на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, ні ў Чэхіі. Папера была італьянскай, французкай або нямецкай вытворчасці, і кошт яе быў вельмі высокі.

А ў першай чвэрці XVI стагоддзя (1522 г.) кнігадрукаванне пачалося ў сталіцы ВКЛ — Вільні. Там Скарына выдаў “Малую падарожную кніжку”, у якую ўвайшлі “Псалтыр”, “Акафісты і Каноны”, “Шасціднеў". Другім і апошнім выданнем стаў “Апостал” (1525 г.). У гэтым годзе ён спыняе сваю друкарскую дзейнасць і адбывае назаўсёды ў Прагу. Апошнія гады свайго жыцця Скарына працуе як медык.

**Бібліятэкар**. Ужо ў першыя дзесяцігоддзі друкарскай і выдавецкай дзейнасці Скарыны яго кнігі сталі вядомы ў розных краінах Заходняй і Цэнтральнай Еўропы. Усе новыя выданні Бібліі прыцягвалі пільную ўвагу царкоўнай і свецкай інтэлігенцыі, якая ўлічвала ролю Бібліі ў духоўнай культуры сярэдневяковай Еўропы як адзінага фундамента рэлігіі і царквы.

Заснаванне Скарынай беларускага кнігадрукавання стала вяршыняй яго духоўнай дзейнасці, найбольш выразным і яскравым пралогам беларускага Адраджэння першай паловы XVI стагоддзя. У друкаванай кнізе Скарына бачыў невычэрпныя магчымасці духоўнай асветы народа, выхавання высокіх хрысціянскіх, маральных і грамадзянскіх якасцяў. Кнігі Скарыны зрабілі вялікі ўплыў на развіццё духоўнай культуры Беларусі, стымулявалі ўзнікненне кнігадрукавання ў Маскоўскай Русі, распаўсюджваліся ў шматлікіх рукапісных копіях. Выданні Скарыны з'яўляюцца ўнікальнымі помнікамі свецкай рэнесансавай біблейскай пісьменнасці. Разам з гэтым яны адлюстроўваюць і асабістыя рысы Скарыны, яго духоўную адоранасць і непаўторнасць, веліч яго подзвігу.

Прадаўжальнікамі кнігавыдавецкай справы Ф. Скарыны ў Беларусі сталі Сымон Будны, які ў 1562 годзе ў Нясвіжы выдаў на беларускай мове “Катэхізіс” — дыдактычны пераказ асноўных ідэй Бібліі з прадмовай і пасляслоўем, блізкімі да адпаведных твораў Скарыны, і Васіль Цяпінскі, які каля 1580 года пераклаў на старабеларускую мову і выдаў “Евангелле” з прадмовай.

Вопыт Скарыны, біблеіста і перакладчыка выкарысталі ў сваёй кнігавыдавецкай дзейнасці Іван Фёдараў і Пётр Мсціславец. На сённяшні дзень падлічана, што ва ўсім свеце захавалася больш за 500 кніг Ф. Скарыны. У Беларусі з іх — дзесяць, усе яны няпоўныя, захоўваюцца ў Нацыянальнай бібліятэцы як калекцыя. У суседняй Расіі гэта лічба дасягае некалькі соцень кніг. Сістэматычна вядуцца перамовы аб магчымасці вяртання нашай спадчыны, пра атрыманне лічбавых копій.

Такім чынам, Францыск Скарына — гэта асоба, якая яднае людзей рознага ўзросту, веравызнання, прафесій. Гэта — адзіны нацыянальны герой, які прымаецца ўсімі прадстаўнікамі беларускага грамадства. На яго радзіме ў Полацку ў 1974 годзе пастаўлены помнік, стваральнікам якога выступіў І. Глебаў. Вышыня бронзавай фігуры — 5,5 м, а скульптуры з пастаментам — 12 м. Ёсць помнікі ў Мінску ва Універсітэцкім гарадку БДУ і каля Нацыянальнай бібліятэкі, а таксама ў г. Ліда і чэшскай Празе.

# ПРАЗДНИК ТОРЖЕСТВА КНИГИ

Литературно-игровая программа

*Сценарий ко Дню белорусской письменности [Электронный ресурс] // Официальный сайт ГУО "Беняконская средняя школа". – Режим доступа : http://benschoolcountry.grodno.unibel.by. – Дата доступа : 22. 05. 2017.*

*«И, как святой Кирилл,*
*и ты не покидай Великого*
*служения славянам…»*
*Ф.Тютчев*

*Формируются две-три команды из представителей 7-9 классов, у каждой команды должно быть название, эмблема, капитан команды. Эмблема и название команды должны иметь непосредственное отношение к теме праздника. Каждая команда готовит один музыкальный номер, либо выступление на 5 минут.*

**Ведущий:** Мы живём в стране, которая называется Республика Беларусь. Каждый человек должен знать и помнить: откуда он родом, кто его предки.

**Чтец 1:** Мы – славяне!

**Ведущий:** Да мы – славяне! Русские, и украинцы, болгары и белорусы, чехи и поляки, сербы, хорваты и словаки – все мы славяне.

**Чтец 2:** Я знаю, что у славян есть праздник «День славянской письменности».

**Ведущий:** Да, ты права. А в нашей республике празднуется ещё и национальный праздник «День белорусской письменности».

**Чтец 1:** Идея праздника – показать тесную связь белорусского печатного слова с его славянскими истоками с историей белорусского народа.

**Чтец 2:** Наш праздник мы посвящаем Дню белорусской письменности, который традиционно проходит в первое воскресенье сентября.

*Из родной Беларуси*
*Я встречаю зарю,*
*Всем мальчишкам девчонкам*
*«Добры дзень!» говорю.*

**Ведущий:** День белорусской письменности впервые прошёл в 1994 году в городе Полоцке.

**Чтец 1:** Впоследствии разные города Беларуси становились столицами белорусского книгопечатания. После Полоцка ими были: Туров, Новогрудок, Несвиж, Орша, Пинск, Заславль, Мстиславль, Мир, Каменец, Борисов, Сморгонь, Хойники.

**Чтец 2:** Программа ежегодного праздника традиционно включает презентации книг и издательств; встречи с писателями; выставки произведений народного творчества; выступления художественных коллективов и конечно открытие разнообразных экспозиций, посвящённых книгопечатанию времен прошлых и нынешних.

**Чтец 1:** Белорусам есть, чем гордиться. В книгах, печатных источниках многовековой памяти, отражаются история народа, его славные дела.

**Чтец 2:** Просветители белорусского народа — всемирно признанные личности. Это и Франциск Скорина, фреска с изображением которого украшает стену Падуанского университета наряду с портретами великих людей эпохи Возрождения; это и Кирилл Туровский, проповедник, оставивший нам поэтичное «Слово о премудрости»; подвижница книжного дела – святая Евфросиния Полоцкая, и Симеон Полоцкий, чье творчество ученые считают не только одним из истоков белорусской литературы, но и началом русского стихосложения и театра.

**Чтец 1:** В праздник Дня белорусской письменности, проходит награждение лучших книгоиздателей года. Победители получают награды Национального конкурса «Искусство книги» и статуэтки «Золотой фолиант».

**Чтец 2**: *«Наш народ сохранил свою душу:*
*православную веру сберёг,*
*храм в душе утвердил – не порушил,*
*и другим утвердиться помог!*

**Чтец 1:**
*Мы живём посредине народов,*
*И с соседями всеми на «Вы»:*
*Такова белоруса природа,*
*Белорусы во всём таковы»*

**Ведущий:** К сегодняшнему празднику вы все готовились и сейчас, я приглашаю представителей от двух команд, участников нашей программы, продемонстрировать свое домашнее задание - представление команд. И так конкурс - представления команд, который называется **«Мы – белорусы!»** (*по очереди выходят команды, представляются и остаются на сцене.).*

*Жюри оценивает конкурс*

Переходим к конкурсу, условное название которого **- «Как ты сердцу мила Беларусь!»**

**Чтец 2:** Какое же задание предстоит выполнить нашим командам?

**Ведущий:** Я предлагаю нарисовать нашу Беларусь, но «нарисовать» не красками и карандашами, а словами и поэтическими строками. Называть следуют одно прилагательное, или одну стихотворную строку.

И так, начинаем по очереди составлять словесную картину. Какая наша страна, ребята? (*поочередно обращается каждому игроку из команд участниц игры*).

*Жюри оценивает конкурс*

**Чтец 1:** Красивая получилась картина – и это всё наша страна, наша Беларусь.

**Ведущий:** В такой замечательной стране живут прекрасные люди, которые сохраняют традиции, чтут культурное и историческое наследие. Люди работают, учатся, воспитывают детей, и сейчас мы попробуем охарактеризовать их.

Наш следующий конкурс - **«Мой народ».**

На первые буквы слов, составляющих название конкурса «Мой народ» необходимо написать по 2-3 прилагательных, подчёркивающих положительные качества наших соотечественников.

*(раздаются карточки-заготовки для выполнения задания, которые через 3-4минуты передаются членам жюри )*

| ***Образец карточки*** | ***Варианты ответов*** |
|---|---|
| **М -** | мирный, мудрый, мужественный, музыкальный |
| **О -** | отважный, одухотворённый, обстоятельный.. |
| **Й(И)-** | интересный, искренний, интеллигентный. |
| | необыкновенный**,** независимый, находчивый |
| **Н -** | активный, авторитетный… |
| **А -** | радостный, работящий, рассудительный.. |
| **Р -** | объективный, одарённый, очаровательный.. |
| **О -** | домовитый, деловой, душевный, добрый |
| **Д -** | |

*Жюри оценивает конкурс*

**Чтец 2:** Пока ребята выполняют задание, объявляем музыкальную паузу, которую представит одна из команд (*заранее оговаривают, кто выступает первый)*

**Ведущий:** Наш следующий конкурс - **«Просветители земли Белорусской».** Вы получите карточки с заданиями Ответы на вопросы по истечении 3-4 минут записываются на специальных бланках и передаются в жюри (*раздаются заранее заготовленные карточки*).

| **№ вопроса** | **Ответ (фамилия и имя просветителя)** |
|---|---|
| | |
| | |
| | |

***Вопросы:***

**№1.** Поэт-гуманист, представитель поэзии эпохи Возрождения. Образование получил в одной из местных кафедральных либо церковноприходских школ, а углублял знания в Вильно, в Польше и Италии. Как человек высокой культуры поэт получил доступ ко двору

великого князя. Затем его стали привлекать для выполнения важных государственных поручений в составе посольских миссий. В Риме он пишет на латинском языке свое гениальное произведение «Песнь о зубре». **(М. Гусовский)**

**№2.** Церковный деятель, писатель, проповедник XII века. Родился и воспитывался в богатой семье, получил прекрасное по тому времени образование. В 1161 году стал епископом. Здесь же протекала и его исключительно плодотворная деятельность. Считается крупнейшим мыслителем и оратором Киевской Руси. Ни по объему оставленного литературного наследия, ни по популярности и авторитету, ему не было равных среди современников Причислен церковью к лику святых. **(Кирилл Туровский)**

**№ 3.** Фигура этого монаха и учёного значительна для истории. Он был приглашён воспитателем и учителем детей царя Алексея Михайловича. Нравоучительные книги, стихи, написанные в разные годы, оказали заметное влияние на белорусскую, русскую и отчасти украинскую философию и литературу. Сборник его стихов, изданный в открытой им же Верхней типографии, подлинная энциклопедия XVII века. **(Симеон Полоцкий)**

**№4.** Белорусский и восточнославянский просветитель-гуманист, писатель и переводчик, который в 1517 г. выпустил Библию в переводе на старобелорусском языке. Был первым доктором медицинских наук в Беларуси, имел степень доктора свободных наук. Он был крупнейший общественный и культурный деятель своего времени, разносторонне образованным человеком. Его книги доносят до нас великие идеи гуманизма, высокой нравственности, равенства всех людей перед Богом, свободы каждой личности. **(Франциск Скорина)**

**1.** Белорусский типограф, соратник русского печатника Ивана Фёдорова. В 1564 году вместе с ними напечатал в Москве первую русскую печатную книгу "Апостол", а в 1565 году - второе издание "Часовника". После вынужденного отъезда из Москвы ими была организована новая типография в литовском городе Заблудове, в имении гетмана Г. А. Ходкевича, где в 1568-1569 годы было напечатано "Учительное евангелие". В 1569 году уехал в Вильно и основал там типографию на средства купцов Мамоничей. В 1574-1575 годы им здесь было напечатано "Четвероевангелие". В 1576 году закончил печатание "Псалтыри". В том же году порвал отношения с Мамоничами, перебрался на Волынь, в имение князей Острожских. **(Пётр Мстиславец)**

**2.** Он продолжил гуманистические и культурно-просветительские традиции Великого княжества Литовского,

заложенные Ф. Скориной, был лично и идейно связан с Симоном Будным, разделял его общественно-политические и религиозные взгляды. В 1570-е. годы на свои средства организовал типографию с намерением издавать книги на западнорусском языке (другие названия - русинский, старобелорусский, староукраинский). У него была хорошая библиотека, необходимая для издательской деятельности. Решившись напечатать Евангелие на двух языках — церковнославянском и западнорусском, он начал тяжелую и сложную по тем временам работу по его переводу (**В.Тяпинский)**

**3.** «И так любила она учиться, что удивляла даже отца своего такой любовью к науке...»

Она тайком ушла в монастырь, и приняла монашеский постриг. Спросив разрешения епископа, перебралась в церковь Святой Софии. Поселившись там, молодая инокиня всецело посвятила себя служению слову – списыванию книг.
С утра до вечера, а то и ночью при свете свечи горбилась она над столом, аккуратно выводя на пергаменте буквы. На списывание одной книги уходили многие месяцы. Занималась она и переводами с греческого языка, который хорошо знала. **(Евфросиния Полоцкая)**

**Чтец 1:** Пока жюри подводит итоги этого конкурса, мы посмотрим выступление ещё одной команды.

**Ведущий:** Продолжаем нашу программу, следующий конкурс - «**Люди. События. Факты».** Команды получат задания, на выполнение которого у них всего 5 минут. А для присутствующих еще одна музыкальная пауза.

***Задания*:**

| Описание задания | Ответ |
|---|---|
| **Отгадайте шараду**:<br>**Го** – частица первая моя,<br>**другая** – есть на реке и в море,<br>А вместе я – известный белорусский город | **Гомель** |
| Назовите известные народные зимние праздники | **Рождество, Коляды, Масленица** |
| Какие города уже дважды встречали у себя день белорусской письменности? | **Полоцк и Туров** |
| **Вставьте пропущенное слово:**<br>«Не тот патриот, кто кулаком в грудь себя бьёт, а тот, кто свою жизнь …….отдаёт» | **Родине** |
| **О чем эти строки:**<br>“І льняная і жытнёвая. Сялянская. Баравая ў казачнай красе. Старажытная. Ты самая славянская. Светлая, як травы ў расе. ..” | **«Беларуская мова»** |
| Скорина хотел сделать книги более | |

| | |
|---|---|
| понятными для людей и делал на их картины или рисунки, полученные путём оттиска с клише. **Как называется такая картина?** | **Гравюра** |
| Поставив буквы в определенном порядке, вы получите слово, которое связано с темой нашего праздника**:** **Н О Ь И М П Т С Н Е Ь С** | **Письменность** |

**Чтец 2:** Вот и подошёл наш праздник к завершению.

Мы просим наше жюри подвести итоги конкурсов и определить команду «Лучшего знатока истории и культуры», посвященного Дню белорусской письменности.

**Ведущий:** За время своего существования День белорусской письменности стал значительным событием культурной жизни страны.

Этот праздник призван повышать престиж письменности как основы многовековой культуры, усиливать ее роль и значение в духовной жизни общества, а также отдать дань глубокого уважения великим белорусским просветителям.

*Жюри подводит итоги, награждает победителей грамотами.*

# КРЫНІЦА РАЗУМНАГА, ДОБРАГА, ВЕЧНАГА

*Літаратурнае свята*

*Крыніца разумнага, добрага вечнага : літаратурнае свята да свята беларускага пісьменства і друку // Папка "Першадрукары, асветнікі, вучоныя", 2005 г.*

**Вяд.** Старыя беларускія кнігі. Дзе Яны? Ці засталіся? А ці былі?
Былі. Засталіся. Толькі падчас нягодаў і ліхалецця разыйшліся па архівах, музеях і бібліятэках усяго свету.

На пергаміне і на паперы, багата аздобленыя і сціплыя, рукапісныя і друкаваныя, старыя кнігі захоўваюць традыцыі і звычаі, нашу мову, нашу культуру. Сёння мы распачынаем Тыдзень беларускага пісьменства і друку ў бібліятэцы. Гучаць цымбалы.Мелодыя "Ад прадзедаў, спакон вякоў... ".

**Вяд.** Бацькаўшчына... Радзіма... Айчына... Родны край... Старонка родная... Усім нам трэба ведаць гісторыю нашай роднай старонкі, арыентавацца ў стагоддзях і постацях, каб шанаваць імёны і подзвігі продкаў і несці подых вякоў у будучыню.

**Чыт.** Не пагарджаць святым сваім мінулым,
А заслужыць яшчэ і вартым быць яго.

**Вяд**. Звесткі пра сівую даўніну, пра падзеі даўно мінуўшых гадоў, мы, безумоўна, можам знайсці ў летапісах.

Летапіс - гэта кніга, у якую адукаваныя людзі запісвалі падзеі: калі пачалася вайна, калі быў добры ўраджай, а калі голад... Гэтых людзей звалі летапісцамі.

**Чыт**. Душой стаміўшыся ў жыццёвых
цяжкіх бурах,
Свой век канчае ён у манастырскіх
мурах ...
Ён пільна летапіс чацвёрты піша
год.
І бачанаму ім - ён годны веры
сведак.
Што тут чынілася ў даўнія гады,
Што думалі, аб чым спрачцліся
тады,
За што змагаліся, як баранілі веру,-
Узнаюць усё гэта патомкі праз
паперу!

*«Летапісец». М. Багдановіч*

**Вяд.** Першыя звесткі пра падзет на сучаснай тэрыторыі Беларусі можна знайсці ў «Аповесці мінулых гадоў». Яе склаў у пачатку XII ст. маннах Кіева-Пячэрскага манастыра Нестар.

**Чыт**. Пад нашэпты пушчаў-бораў,
Пад напевы завірухаў
Летапісец творыць творы,
А ты слухай, шчыра слухай.
Як жылі, як вечавалі,
Як пасля былі ў прыгоне,
Адаб'е, як у крышталі,
Летапісец наш сягоння.

*«Наш летапісец». Я.Купала*

**Вяд.** Шлях да пісьменнасці быў доўгім і складаным. Прынята лічыць, што пачатак яму быў пакладзены каля 6-ці тысяч гадоў таму, прыкладна, у чацвёртым тысячагоддзі да нашай эры.

Кніга ж на Беларусі з'явілася ў X стагоддзі, разам з хрысцянствам. Яна прыйшла ўрачыста, на самае пачэснае месца. Якія б высокія, мураваныя ці драўляныя ні былі дамы ў горадзе і вёсцы-над кожным паселішчам велічна ўзвышаўся храм. А ў цэнтры храма, на спецыяльным прастоле, было месца кнігі - Евангелля - яго ўрачыста выносілі, яго цалавалі, як ікону, яму кадзілі, на Евангеллі прысягалі сведкі на судах.

Еўфрасіння Полацкая... Без гэтага імя не толькі не магчыма ўявіць духоўнае жыццё на Беларусі ў XI1 ст., Але і усю шматвяковую гісторыю нашай радзімы.

**Чыт.** Вякі,
Нібы туман наддзвінскі сіні,
Сплылі за перакаты на спакой...
Ўскрыліла над зямлёю Еўфрасіння
Асветніцай,
Пакутніцай,
Святой.

*В.Лукша*

Адкрывала школы і вучыла,
Кнігі перапісывала штодня!
Славу здабыло па ўсёй Айчыне
Еўфрасінні Полацкай імя.

В.Іпатава

**Вяд.** Ахвярная праца святой Еўфрасінні, як і яе славутых сучаснікаў Клімента Смаляціча, Кірылы Тураўскага, дазволіла падняць культуру нашых продкаў на вельмі высокі ўзровень.

Праславілася беларуская зямля сваімі сынамі і дочкамі на ўвесь свет.

Яшчэ адно імя, якое вядома ўсяму свету. Менавіта ён - Францыск Скарына - «прынёс свае кнігі дадому».

**Чыт**. Шмат я па свеце прайшоў,
шукаючы ўдачу,
Многа пабачыў.
...Радзімы ж сваёй не адрокся
ні ў шчасці, ні ў горы.
Мэту маю і надзею, пакуту маю
і трывогу-
З літар, як з кропелек поту, збіраў
я свае першадрукі
Не для цароў венцаносных,
абраннікаў бога,
А для цябе,
светласэрцы мой люд чарнарукі.
Як я хацеў,
Каб ты вольнасці здолеў напіцца,
Каб пасяліў назаўсёды ў хацінах
асвету,
Вокладкі кніг расхінуў -
як адчыніў аканіцы –
І падзівіўся бязмежжу і мудрасці
свету.

**Вяд.** А першы крок да святла, да пазнання свету - гэта кніга, пісьменнасць.

**Чыт**. Я множыў слова - адліваў
у шрыфце,
Па полі белым сыпаў, як з сяўні.
Патрэбна ж людзям столькі
дабрыні,
Святла, прачыстай праўды
з глыбіні -
Без гэтага ўсяго, хто мы, скажыце?

**Вяд.** Многія беларускія пісьменнікі прысвечалі Скарыну ўзнёслыя словы.

**Чыт.** Асветнік, вучоны
І першадрукар,
Наш гокар - Францішак Скарына.
Запомні ўсім сэрцам
Як велічны дар
Радзімы
Славутага сына.

Праклаў ён дарогу

Да Слова, Святла,
За матчыну Мову
Паклікаў змагацца,
Каб вольнай заўсёды
Між вольных магла
Дзяржаваю Белая Русь
Называцца.

*М.Пазнякоў*

**Вяд.** А цяпер, нашы паважаныя чытачы, правядзём з вамі гістарычна-пазнавальную віктарыну “Невядомы Скарына”. Мы вам прапануем адказы, а вы выбірайце правільныя.

**1.** На чым высякалі першыя літары?
-на сцяне
-на бервяне
-на вадзе
**-на камні**

**2.** Хто быў першым кнігадрукаром усходніх славян?
- Пушкін
-Фёдараў
-**Скарына**
-Колас

**3.** Як звалі Скарыну?
-Ясь
-Міхась
**-Францішак**
-Бенедыкт

**4.** Колькі год з дня нараджэння Ф.Скарыны адзначыць Беларусь у 2005 годзе?
-6
-60
-**215**
-120

**5.** У якім горадзе нарадзіўся першадрукар ?
-у Нясвіжы
-у Парыжы –
**-у Полацку**
-у Мінску

**6.** А ў якой сям'і?
-князя
**-купца**
-бізнесмена
-настаўніка

**7.** Дзе вучыўся Скарына?
-у Азіі

**-у Еўропе**
-у Афрыцы
-у Амерыцы
**8**. Якую прафессію ён атрымаў?
-плотніка
**-доктара**
-спевака
-гандляра
**9**. Як называлася першая кніга, надрукаванная Скарынам?
-«Міколка-паравоз»
**-Псалтыр**
-«Прыгоды бібігона»
-Буквар
**10.** У якім горадзе яна была надрукавана?
-Мінску
-Маскве
-Лондане
**-Празе**
**11.** На якой мове?
-лацінскай
-кітайскай
-раскай
**-беларускай**
**12.** Якія кнігі выдаваў Скарына?
-гумарыстычныя
**-біблейскія**
-дэтэктывы
-п'есы
**13.** Якая дата лічыцца пачаткам усходнеславянскага кнігадрукавання?
-7 лістапада 1917г.
-12 красавіка 1961 г.
**-6 жніўня 1517г.**
-9 мая 1945г,
**14.** Што ў Мінску названа іменем Скарыны?
-тэатр
-праспект
-плошча
**-школа**

Падводзяцца вынікі гульні, пераможцам уручаюцца прызы. Усіх прысутных вітаюць з пачаткам Тыдня беларускага пісьменства і друку. Вядучы знаёміць з планам правядзення мерапрыемстваў аб беларускай кнізе і беларускім кнігавыданні на ўвесь тыдзень.

**Вяд.** Кніга есць і будзе падмуркам духоўнага жыцця народу. Чорныя адбіткі літар на белай паперы, лісты, якія сабраны у кнігу - лепшае сховішча думкі, крыніца новых ідэй і перамога над вечнасцю.

**Вяд.** Прыходзьце ж да нас у бібліятэку!

Ведайце, тут сабрана усё самае лепшае, самае карыснае, чаго дасягнула чалавецтва у пазнанні ісціны і прыгажосці. Прыходзьце, і можа, тады, разам з цудоўнымі творамі паэтаў,навукоўцаў, артыстаў усіх часоў і народаў, вы па-новаму зірнеце навокал і убачыце новыя.

Прыходзьце да нас!
…Кніга! Нам прыносіць словы
Праўду, вернасць і адвагу,
І зялёны свет дубровы,
І чырвоны колер сцягу
Колькі фарбаў захавана
У чорных літарах чароўных?
Колькі ёсць вышынь нязеачных
У радках – сцяжынках роўных?

# ПРАЗ СМУТУ СТАГОДДЗЯЎ ДАЖЫЛА ДА НАС СЛОВА

*Літаратурна-музыкальная кампазіцыя*

*Праз смуту стагоддзяў дажыла да нас слова : літаратурна-музыкальная кампазіцыя да 900-годдзя з дня нараджэння Ефрасінні Полацкай // Папка "Першадрукары, асветнікі, вучоныя", 2001 г.*

**Вяд**. Есць людзі, чые малітвы хутчэй за іншыя даходзяць да Бога. Яны вылучаюша сярод падобных да сябе незвычайнай дабрыней, чалавечнасцю, спагадлівасцю і становяцца нават пасля смерці сваей яркімі паходнямі, якія асвятляюць нашчадкам шлях да духоўнай дасканаласці.

**Вяд**. Ефрасіння Полацкая... Без гэтага імя немагчыма уявіць не толькі духоўнае жыцце на усходнеславянскіх землях у 12 стагоддзі, але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Князёўна, Ігуменні, настаўніца, выдатная асветніца святая Ефрасіння пакінула пра сябе вечную памяць у душы народа. І сёння мы паведзем гутарку аб яе жыцці і дзейнасці.

Ефрасіння Полацкая

Мінуласць ляжыць надмагільным вянком
над тымі, што ў смерці застылі,
зяяе святлом праз цемру вякоў
святое імя Ефрасінні.
А доля ж была ў крівіцкіх жанчын
з кудзляю, з прасніцай злучана.
Яна ж за асветніцкі слаўны пачын
дастойна прайшла ў неўмеручасць.
Ад Лады, вяснянай красуні у бары,
ад моцы Ярылы, Стварога
знайшла сярод вечна паганскай пары
да мудрасці новай дарогу.
Яшчэ над Дзвіною старыя багі
у сялібах людзьмі карагодзянь,
яе ужо прывабіў свет праўды другі,
што неслі Кірыл і Мефодзій.
У пушчы-лясы адыходзяць далей
продкаў сівых абаронцы.
Пісьменніцтва, новая вера мацней
За усіх багоў грому і сонца.
Народ яшчэ даўніх мілуе багоў.
З кашення ім стодзіва ставіць.

Абараняць іх у пушчах гатоў
І моц над людзмі славіць.

Дарэмна. Другія стаяць алтары.
У Прадыславы мэта –
святыні, цэрквы, манастыры –
тагачасныя універсітэты.

*Генію ш Л. Ефрасіння Полацкая.*

Яна прыйша на свет на пачатку XII стагоддзя ў Полацку, у сям'і князя Святаслава-Георгія і даводзілася ўнучкай найславуцейшаму з полацкіх валадыроў Усяславу Черадзею. Дзяўчынку назвалі старажытным полацкім Імем Прадслава.

Сілай духоўнай узводзіла Полацк высока
Тым, хто імкнуўся да кнігі,
Свяціла, бы зорка...
Мове, адзінай дзяржаве
шчэ толькі злучацца –
Свет нас прымаў як народ
па адной палачанцы.
Як маладзік, узышля, засвяціла шчыра
па - над вайной рассявальніцай цемры на шлях.
Унучка змаганца асветніцкі выбрала вырай.
Павандравала...
Як, маладзік, узышла...
Сталыя, моладзь!
Да слова пара падключыцца
з поўнай напругай!
Даволі ўзаемных абраз!
Зверым душу па натхняльніцы,
па палачанцы!
Душу ўздымае духоўна
жаночы абраз.

*(Данута Бічэль - Загнетава паэма
"Яфрасіння Полацкая")*

**Вяд.** Слава пра розум і прыгажосць полацкай князеўны разнеслася далека на славянскіх землях. Калі Прадславе споўнілася дванаццаць гадоў (у такім вяку дзяучынка ўжо лічылася тады нявестаю), у Полацк зачасцілі сваты.

**Вяд.** Бацькі меркавалі выдаць князеўну замуж за сына нейкага слаўнага сваім багаццем і княжаннем уладара.

Аднак Прадслава абрала сябе іншы шлях: вырашыўшы стаць хрыстовай нявестаю, яна прыйшла ў манастыр і прыняла пострыг пад іменем Еўфрасінні.

Спачатку маладая манашка пасялілася у кеглі Сафійскага сабора. Тут перапісвала і перакладала з іншых моваў кнігі і, як лічаць некаторыя, вяла Полацкі летапіс.

**Вяд.** Праз колькі гадоў духоўнага ўдасканалення яна заснавала ў Полацку жаночы, а затым і мужчынскі манастыры.

Пры іх Еўфрасіння адчыніла скрыпторыі — майстэрні па перапісванні кніг, а таксама школы, у якіх дзеці аваладвалі граматай, вучылі гісторыю, грэцкую і лацінскую мовы, спасцігалі навуку красамоўніцтва.

**Вяд.** Асветніца збірала вакол сябе таленавітых людзей, і таму яе можна назваць нашай первай меценаткаю. На яе заказ полацкі дойлід Іван пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, а ювелір Лазар Богша стварыў крыж - бясцэнную святыню беларусаў, якому ў 2001 г. спаўняецца 840 год з часу стварэння.

**Вяд.** Найсвяцейшы патрыярх Маскоўскі і ўсяе Русі Алексій II, які з 23 па 27 чэрвеня 2001г. знаходзіўся з візітам у Беларусі, у першы дзень свайго знаходжання ў Брэсцкай вобласці асвяціў і ўклаў у стаўратэку (футляр) Крыж Еўфрасінні Полацкай. Адноўлены брэсцкім мастаком- эмальерам Мікалаем Кузьмічом, крыж захоўваецца ў царкве Спаса- Еўфрасіннецкага манастыра, Да прыезду кіраўніка Рускай праваслаўнай царквы ён быў спецыяльна прывезены з Полацка ў Брэст. Святым крыжом Алексій II ахінуў усіх, хто быў у храме і ля царквы. Пасля гэтага крыж быў укладзены на аналой, і ўсе жадаючыя змаглі падыйсці і прыкласціся да яго.

*(Народная воля №115, 26 чэрвеня 2001г.)*

**Вяд.** Унучка Усяслава Чарадзея ўздымала свой голас супраць княжацкіх усобіц, папярэджвала, што братазабойчыя войны могуць прывесці Бацькаўшчыну да гібелі. Прыклад асветніцы натхняў яе землякоў і наступнікаў Францішка Скарыну, Васіля Цяпінскага, Сымона Полацкага... Аўтар "Жыцця" Еўфрасінні піша, што хацела яна "міра князя з князем, баярына з баярынам."

**Вяд.** У канцы жыцця Еўфрасіння вырашае ажыццявіць паломніцтва ў Іерусалім. Сваякі, усе палачане прасілі яе не пакідаць іх адніх у цяжкі час. Яна суцешала ўсіх, абяцая, што будзе маліцца там за ніх і за мір на роднай зямлі. Еўфрасіння выехала з Полацка пасля Каляд у 1173г., каб вясной быць у Візантыі. У Іерусалім паломніца прыбыла ў красавіку, две прынесла ў дар храму Гроба Хрыстова Залатую кадзільніцу. Наведаў святыя месцы, яна неўзабаве захварэла і праз 24 дні тут жа, у Іерусаліме, памерла.

**Вяд.** Пасля смерці кананізавана праваслаўнай і каталіцкай цэрквамі. Мошчы святой Еўфрасінні спачываюць у Спасаўскай царкве полацкага Спаса-Еўфрасініцкага манастыра. Дзень памяці нябеснай заступніцы Беларусі святкуецца 5 чэрвеня.

5 чэрвеня- гэта адметнае свята беларускай жанчыны, таму што асоба нашай святой унікальна не толькі ў Беларусі, але і ў Еўрапейскай цывілізацыі. Ды і ва ўсей сусветнай гісторыі.

**Вяд.** Мы - народ, які атрымаў такія ўдары лесу, што ў ім засталося напаверхні адно - імкненне выжыць. Ды магутныя нашы карані жывыя - цяпер час адраджаць парасткі і берагчы іх, каб падняліся на месцы духоўнай пустыні тыя свяшчэнныя дрзвы, якія ўдалося вырасціць папярэднікам і ў засені якіх народ адпачывае душой у часіны міру і пакою. Асабліва гэта важна цяпер, калі на сутнасці нанава закладзены асновы нашай дзяржаўнасці. Усцешлівы факт гэтага складанага, але няухільнага працесу - публікацыя перакладу “Жыція Ефрасінні Полацкай” на беларускую мову. Незвычайны лес Ефрасінні, самаадданнае служэнне роднай зямлі, якое ўзняло знакамітую палачанку высока над сваей эпохай, прыцягваюць не толькі вучоных - гісторыкаў.

**Вяд.** Пісьменніца Вольга Іпатава стварыла вобраз асветніцы ў гістарычнай аповесці “Прадслава”, дзе жыцце нашай зямлячкі паказана на фоне яе драматычнага і супярэчлівага часу.

Экскурс у Полацк XII стагоддзя робіць у рамане "Святыя грэшнікі" адзін са старэйшых беларускіх празаікаў Алесь Асіпенка.

Ефрасінні і яе славутым сучаснікам і паплечнікам дойліду Іоану і майстру- ювеліру Лазару Богушу прысвяцілі свае вершы, паэмы, апавяданні Алесь Разанаў, Данута Бічэль-Загнетаева, Таіса Бондар, Ларыса Геніюш, Генадзь Бураўкін, Сяргей Тарасаў.

Асоба асветніцы вабіць да сябе і сучасных мастакоў. Іконаграфія Ефрасінні налічвае ужо некалькі дзесяткаў твораў. Сярод іх вылучаюцца палотны вядомых беларускіх жывапісцаў Аляксея Марачкіна і Ніколь Шчаснай, графічныя аркушы Арлена Кашкурэвіча. Яе імя ўзнікае ў памяці пры знаемстве з адухоўленымі жаночымі вобразамі Старажытных палачанак скульптара Алеся Шатэрніка.

У 1993 годдзе - арганізованы Міжнародны жаначы фонд Святой Еўфрасінні Полацкай. Прэзідэнт фонду Валянціна Коўтун напісала раман "Пакліканыя". Урыўкі з гэтага рамана пабачылі свет на старонках газеты "Лі Ма" і часопіса "Беларусі".

Свае апавяданне аб жыцці Е. Полацкай закончым духоўным запаветам з яе жыція:

"Вось сабрала вас, нібы птушанятаў, пад крылы свае і на пашы, нібы авечак, каб вы пасвіліся на Божых наказах.

І я з лёгкім сэрдцам стараюся вучыць вас, бачачы плен вашай працы, і такі додж вучэння на вас праліваю! Але ж вашыя нівы стаяць, не ўзыходзячы і не ўзрастаючы ўгору, а год ужо завяршаецца, і лапата ляжыць пры гумне. І я баюся, што будзеце вы пустазеллем, і аддадуць вас агню непагаснаму. Пастарайцеся ж дзеці мае пазбегнуць яго і ўчыніце сябе пшаніцаю чыстаю, і змяліцеся ў жорнах уміранасцю, малітвамі, постам, каб чыстым хлебам, прынесціся на трапезу Хрыстову!”

# ДУХОЎНАЯ КНІГА — КРЫНІЦА ВЯЛІКАЙ МУДРАСЦІ

*Літаратурна-музычная кампазіцыя*

*Гудко Н. Духоўная кніга – крыніца вялікай мудрасці / Н. Гудко // Асветнікі зямлі беларускай / склад. : Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінск, 2014. – С. 4-8. – (Бібліятэка прапануе).*

*Гэтай повязі kроўнай, якой мы прывязаны*
*Да бацькоўскай зямлі, —*
*не парвуць, не растурзаюць*
*Аніякія буры-вятры непрыязныя, —*
*Нашы сэрцы ад іх толькі больш загартуюцца.*

*Ніл Гілевіч*

*Ціха гучыць інструментальная музыка.*

**Вядучы 1.** Для кожнага жыхара Беларусі першая нядзеля верасня — асаблівая, святочная. У шумлівыя паўсядзённыя размовы ўключаецца важкае, выверанае стагоддзямі, поўнае мудрасці і стваральнай энергіі Роднае Слова. Менавіта ў гэты дзень у нашай рэспубліцы, пачынаючы з 1994 года, адзначаецца Свята беларускага пісьменства.

Гэты дзень стаў нацыянальным святам беларусаў, якое ўвасабляе адзінства друкаванага слова і гісторыі нашага народа, яго цеснай сувязі са славянскімі вытокамі, а таксама асэнсаванне гістарычнага шляху пісьменства, далучэнне да духоўных святыняў. А імі, як правіла, былі калісьці рэлігійныя цэнтры, якія з'яўляліся сапраўднымі асяродкамі культуры, ведаў, духоўнасці.

**Вядучы 2.** Першай сталіцай свята пісьменства стаў Полацк (1994, 2003) — калыска беларускай дзяржаўнасці і культуры, горад, звязаны з імёна-мі першай асветніцы Е. Полацкай і першадрукара Ф. Скарыны. Паспеўшы стаць традыцыйным, свята прайшло па знакамітых цэнтрах беларускай асветы, сярод якіх Тураў (1995, 2004), Навагрудак (1996), Нясвіж (1997), Орша (1998), Пінск (1999), Заслаўе (2000), Мсціслаў (2001), Мір (2002), Камя-нец (2005), Паставы (2006), Шклоў(2007), Барысаў (2008), Смаргонь (2009), Хойнікі (2010), Глыбокае (2012), Быхаў (2013), Заслаўе (2014).

**Вядучы 1.** Як правіла, кожнае свята пакідае знакі павагі да людзей, якія сваім служэннем Айчыне засталіся ў гістарычнай памяці народа. Так, устаноўлены помнікі Пятру Мсціслаўцу (Мсціслаў, 2001), Сімяону Полацкаму (Полацк, 2003), Кірылу Тураўскаму (Гомель, 2004), Святому Елісею Лаўрышаўскаму (в. Лаўрышава каля Навагрудка, 1996), Еўфрасінні Полацкай (Полацк, 2000), Сымону Буднаму і Васілю Цяпінскаму (Мінск,

2000) і наватлітары «Ў» (Полацк, 2003). Першым манументам гістарычнай асобе, выдатнаму дзеячу эпохі Адраджэння Беларусі стаў помнік Ф. Скарыне ў Полацку.

**Вядучы 2.** З глыбокай старажытнасці дайшло да насжыватворнаеслова роднай мовы. Праз стагоддзі і цяжкія выпрабаванні данеслі яго нашчадкам выдатныя асветнікі і творцы, якія аб'ядноўвалі народ магутнай сілай, вучылі размаўляць, спяваць песні, складаць вершы пра шчасце і волю на роднай мове.

**Вядучы 1.**

*Слова наша роднае, хапала*
*На стагоддзі доўгія цябе.*
*Багдановіч, Колас і Купала*
*Прыпадалі да цябе ў журбе.*
*Адкідалі кпіны і абразу,*
*Здзён былых цягнулі ў заўтра ніць,*
*І хаця не ўсіх і не адразу,*
*Навучылі ўсё ж цябе цаніць.*
*Вымытае ў гулкіх навальніцах,*
*Нам, як запавет, перадалі,*
*Каб пілі і не маглі напіцца*
*І ўзнялі наўздзіў усёй зямлі.*

**Вядучы 2.** Сапраўды, нам ёсць што ўзгадаць, нам ёсць чым ганарыцца. У нашай краіне заўсёды шанавалі друкаванае слова. Беларускае кнігадрукаванне мае больш чым 500-гадовую гісторыю. Мы павінны ведаць і памятаць, што 6 жніўня 1517 года ў Празе Скарына надрукаваў першую кнігу — «Псалтыр».

Ф. Скарына... Фрэска з яго выявай ўпрыгожвае сцяну Падуанскага ўніверсітэта побач з партрэтамі іншых гігантаў эпохі Адраджэння.

Традыцыі нашага першадрукара плённа прадоўжылі Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Іван Фёдараў, Пётр Мсціславец, браты Мамонічы і многія іншыя асветнікі. Дзе б мы ні знаходзіліся, павінны ганарыцца гэтым, ганарыцца прыгожым, поўным жыццёвай мудрасці, мілагучным, звонкім Родным Словам, якое вытрымала і знявагу, і забарону, і здзек.

**Вядучы 1.** Асветнікі беларускага народа — фігуры еўрапейскага маштабу. Кірыла Тураўскі, прапаведнік, які пакінуў нам паэтычнае «Слово о премудрости»...

Гонарам і славай Полацка з'яўляецца беларускі і рускі асветнік, царкоўны і грамадскі дзеяч, паэт, драматург, прапаведнік, публіцыст Сімяон Полацкі. У1664 годзе ён пераехаў у Маскву, дзе вельмі хутка дабіўся трывалага становішча пры царскім двары. Напачатку паводле ўказа цара ён пачаў выкладаць лацінскую мову ў Прыказе тайных спраў пры Заіка-наспаскім манастыры. А праз некаторы час як таленавіты і высокаадукаваны педагог быў прызначаны на высокую пасаду настаўніка царскіх дзяцей

Аляксея і Фёдара Аляксеевічаў, а пазней — у якасці выхавальніка і назіральніка над навучаннем царэўны Соф'і і малалетняга Пятра І.

**Вядучы 2.** Адкрыццё першай у Расіі «Верхняй» друкарні ў Крамлі — ініцыятыва Сімяона Полацкага, праект заснавання першай расійскай вышэйшай навучальнай установы — Маскоўскай славяна-грэка-лацінскай акадэміі — задума Полацкага. Стварэнне першага «школьнага» тэатра пры акадэміі — таксама з яго ініцыятывы.

**Вядучы 1.** Яшчэ адзін асветнік — Сымон Будны — валодаў энцыклапедычнымі ведамі і майстэрствам перакладчыка і ўвайшоў у нашу сучаснасць як своеасаблівы і непаўторны чалавек. Вядома, што ён выкладаў па-беларуску катэхізіс у пратэстанскай школе ў Вільні. Затым яго прызначаюць пастарам Клецкай саборнай царквы кальвіністаў. Там ён захапіўся асветай «простых людзей» і стварыў свой «Катэхізіз» — гэта адзіная з напісаных на беларускай мове кніг, якая дайшла да нашага часу. Астатнія ж творы С. Буднага як перакладныя, так і арыгінальныя, напісаны на польскай і літоўскай мовах. У Нясвіжы ў 1562 годзе разам з тагачасным старастам ён заснаваў вядомую Нясвіжскую друкарню. У ліку кніг, якія выдаваліся пры ўдзеле Буднага ў Нясвіжы, Біблія, Новы Запавет, а таксама іншыя творы рэлігійнага і сацыяльна-філасофскага характару.

**Вядучы 2.** Мінуласць ляжыць надмагільным вянком
*Над тымі, што ў смерці застылі.*
*Ззяе святлом праз цемру вякоў*
*Святое імя Еўфрасінні.*

Л. Геніюш

**Вядучы 1.** Еўфрасіння Полацкая... Без гэтага імя немагчыма ўявіць нетолькі панараму духоўнага жыцця на ўсходнеславянскіх землях у XII стагоддзі, але і ўсю шматвяковую гісторыю Беларусі. Князёўна, ігумення, выдатная асветніца, пра якую «Жыціе» кажа, што яна «небопарный орёл, попаривши от Запада и до Востока, яко луча солнечная, просветивши всю землю Полоцкую», святая Еўфрасіння пакінула па сабе вечную памяць у душы народа.

Прадслава (свецкае імя Еўфрасінні) нарадзілася ў Полацку каля 1102 года. Паходзіла з роду Полацкіх князёўз дынастыі Рурыкавічаў па мужчынскай лініі і з дынастыі Рагвалода па жаночай лініі. Была нашчадкам вялікага князя кіеўскага Уладзіміра, хрысціцеля Русі. Унучка славутага полацкага князя Усяслава Чарадзея. Бацька яе князь Святаслаў. Маці Сафія была дачкой кіеўскага князя Манамаха.

**Вядучы 2.** Паміж намі і часам, калі жыла знакамітая палачанка, ляжыць больш за восем стагоддзяў. Не дзіва, што гісторыя захавала пра яе не надта багатыя звесткі. Але і яны дазваляюць убачыць агульнаеўрапейскую значнасць асобы гэтай жанчыны-падзвіжніцы. Ахвярная праца святой Еўфрасінні, як і яе славутых сучаснікаў Кірылы Тураўскага і Клімента Смаляціча, абумовіла высокі культурны ўздым на зямлі нашых продкаў.

Адзінай гістарычнай крыніцай, у якой распавядаецца пра жыццё полацкай князёўны, з’яўляецца «Жыціе святой і найпадабнейшай Еўфрасінні», створанае ў канцы XII ст. Да названай дакументальнай крыніцы далучаюцца звесткі з летапісаў гэтага перыяду. Як толькі Прадславе споўнілася 12 гадоў (а гэта быў узрост, калі паводле кананічнага права дзяўчына магла ўжо выходзіць замуж), да яе сталі засылаць сватоў князі. Тады дзяўчына адмовілася ад дынастычнага шлюбу і вырашыла пайсці ў манастыр, дзе ігуменняй была яе цётка. Нягледзячы на ўгаворы бацькоў не пакідаць свецкае жыццё і выйсці замуж, Прадслава рашуча выказала сваё жаданне пайсці ў манастыр. І бацька вымушаны быў урэшце даць сваю згоду на гэта.

**Вядучы 1.**

*А доля ж была ў крывіцкіх жанчын*
*з кудзеллю, з прасніцай злучана.*
*Яна ж за асветніцкі слаўны пачын*
*дастойна прайшла ў неўміручасць.*

Л. Геніюш

Пастрыг Еўфрасінні адбыўся таемна, і яна ўзяла гэта хрысціянскае імя, ахвяруючы сябе Хрысту.

За парогам манастыра засталася юная прыгажуня Прадслава, а замест яе з’явілася асветніца і кніжніца Еўфрасіння.

**Вядучы 2.** Асветніцкая дзейнасць Еўфрасінні Полацкай была шматграннай. Яна знаходзілася ў цэнтры духоўнага жыцця Полацкага княства, яна нястомна збірала вакол сябе таленавітых людзей, стала нашай першай мецэнаткай. Па яе заказ удойлід Іван пабудаваў сусветна вядомую царкву Спаса, майстар-ювелір Лазар Богша ў 1161 годзе зрабіў для Еўфрасінні свой слынны крыж — першы неацэнны твор старажытна беларускага мастацтва, які знік у пачатку Вялікай Айчыннай вайны.

Адным з накірункаў яе дзейнасці было садзейнічанне пабудове храмаў. Заснаваныя святой манастыры сталі асяродкам асветы ў Полацкім княстве.

У іх знаходзіліся школы, дзе дзеці вучыліся чытанню, пісьму, лічбам, царкоўным спевам і нотнай грамаце. Устарэйшымузросцедзеці,акрамя царкоўнаславянскай мовы, вывучалі грэчаскую, атрымлівалі звесткі з прыродазнаўства, медыцыны, рыторыкі, гісторыі.

Да асветніцкай дзейнасці можна аднесці і адкрыццё бібліятэк са скрыпторыямі (дзе перапісваліся кнігі), іканапіснай і ювелірнай майстэрань. Яна складала і запісвала малітвы і пропаведзі.

**Вядучы 1.**

*Дарэмна. Другія стаяць алтары,*
*У Прадславы мэта —*
*святыні, цэрквы, манастыры —*
*тагачасныя універсітэты.*
*Вяртаецца ў край з навукай, з дабром,*

*братэрства і мір у ім сее.*
*Валодае смела князёўна пяром,*
*людзьмі завалодаць сумее.*

Л. Геніюш

Сваёй культурна-асветніцкай дзейнасцю Еўфрасіння Полацкая яшчэ ў пачатку нашай гісторыі, у яе полацкі перыяд, вызначыла важную ролю культуры ў жыцці народа і падала прыклад служэння ў галіне культуры. Яна стала сімвалам духоўнага служэння сваёй радзіме, невычарпальнай крыніцай маральнай сілы і духоўнага адраджэння народа. Еўфрасіння, жывучы ў келлі царквы Святой Сафіі ў Полацку, самаручна пісала кнігі. Грошы, атрыманыя ад іх продажу, раздавала бедным.

**Вядучы 2.** Менавіта ў адносна спакойныя для Полацкага княства гады ігуменне вырашыла здзейсніць паломніцтва ў Святую Зямлю. Знясіленая падарожжам, Еўфрасіння цяжка захварэла і, прыняўшы прычасце, памерла ў Іерусаліме. Гэта быў 1167 год. Мошчы святой у 1187 годзе былі перапахаваны ў Феадосіевай пячоры Кіеўскага Пячорскага манастыра.

У канцы 1943 года мошчы Еўфрасінні былі ўрачыста перавезены ў Полацк, у храм Святога Спаса, дзе з таго часу і зберагаецца святыня.

**Вядучы 1.** Еўфрасіння Полацкая — наша заступніца. Можа, дзякуючы ёй наш беларускі народ, нягледзячы на ўсе цяжкасці і выпрабаванні, што дасылае яму час, застаецца ў большасці сваёй дружалюбным, міралюбівым, цярплівым і чулым да чужой бяды.

*Сілай духоўнай узвысіла Полацк высока.*
*Тым, хто імкнуўсяда кнігі, свяціла, як зорка...*
*Мове, адзінай дзяржаве*
*Шчэ толькі злучацца —*
*Свет нас прымаў як народ*
*Па адной палачанцы.*

Д. Бічэль-Загнетава

**Вядучы 2.** Як бачым, беларускаму народу пашчасціла на славутых продкаў, дзейнасць якіх складае цэлыя эпохі ў культурным жыцці краіны.

Ёсць людскія лёсы, што прамільгнуць на жыццёвым небасхіле вокаімгненнай знічкай і знікнуць назаўсёды. А ёсць імёны, што гараць стагоддзямі яснай зоркай у сусвеце жыцця. Кожнае імя, што захавала наша гісторыя, мы павінны ведаць і шанаваць, бо ў гэтым аснова нашай чалавечай годнасці, з гэтага пачынаецца клопат пра дзяржаву, пра яе культуру, духоўнасць.

**Вядучы 1.** Прыемна адзначыць, што нарэшце настаў той час, калі вартасць культурных здабыткаў нашых продкаўацэнена і прыкладваюцца намаганні для захавання іх дзеля наступных пакаленняў. Яскравым прыкладам служыць выданне «Жыція блажэннай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Уседзяржыцеля Святога Спаса ў горадзе Полацку», якое выйшла

абмежаваным тыражом (усяго 100 асобнікаў). Шыкоўнае знешняе аздабленне цалкам адпавядае багатаму зместу твора. Наша бібліятэка стала шчаслівай уласніцай такога рэдкага экзэмпляра.

**Вядучы 2.** Ініцыятары выдання: Расійская нацыянальная бібліятэка, Выдавецтва Беларускага Экзархата Маскоўскага Патрыярхата, Нацыянальная бібліятэка Беларусі, Міжнародны дабрачынны фонд «Семья — единение — Отечество». Гэта факсімільнае ўзнаўленне з фондаў Расійскай нацыянальнай бібліятэкі. Адна кніга ўяўляе сабой арыгінал «Жыція...», дзе захаваны царкоўнаславянскі тэкст з усімі асаблівасцямі: арфаграфічныя памылкі, фон, нават пашкоджаныя ад часу старонкі, таўшчыня паперы. Другая кніга ўтрымлівае прадмову і тэкст «Жыція...» на царкоўнаславянскай, рускай, беларускай і англійскай мовах. Узорчаты скураны пераплёт надае выданню асаблівы шыкоўны выгляд. Нават па знешняй прыкмеце адчуваецца каштоўнасць друкаванага дакумента.

**Вядучы 1.** «Жыціе блажэннай Еўфрасінні, ігуменні манастыра Уседзяржыцеля Святога Спаса ў горадзе Полацку» — адзін з ранніх помнікаў усходнеславянскай пісьменнасці, створаны ў канцы XII ст. Першапачатковы тэкст «Жыція...» невядомы, да нашых дзён дайшлі толькі тэксты пазнейшых перапрацовак (лічыцца, што першапачаткова «Жыціе...» мела кароткі характар, а перапрацавана і пашырана было толькі ў канцы XV ці ў пачатку XVI ст.).

**Вядучы 2.** Невядомым застаўся і аўтар старажытнага «Жыція...» Аднак даследчыкі лічаць, што ім быў не проста сучаснік Еўфрасінні, а хутчэй за ўсё блізкі да яе атачэння чалавек. Магчымым аўтарам «Жыція...» называюць Міхаіла, слугу Еўфрасінні, магчыма, манаха мужчынскага манастыра, які яна заснавала. Бытуе меркаванне, што твор належыць пяру манаха Давіда. Выказана меркаванне, што аўтарам магла быць манахіня Еўпраксія — сястра і спадвіжніца Еўфрасінні, якая знаходзілася побач з Прападобнай на працягу многіх год.

**Вядучы 1.** Да нашых дзён «Жыціе...» дайшло ў позніх спісках (XVI — XVIII стст.), аднак у навуковай літаратуры ўпамінаюцца таксама спіскі XV ст., і нават спісак XIV ст. Вядомыя ў наш час спіскі «Жыція...» (звыш 180) дзеляцца даследчыкамі на некалькі рэдакцый. Адзін са спіскаў «Жыція...» сярэдзіны XVI ст., які адносіцца да рэдакцыі змешанага складу, захоўваецца ў Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ўСанкт-Пецярбургу. І з гэтай крыніцы зроблена факсімільнае ўзнаўленне, упершыню твор перакпадзены на некалькі моў.

**Вядучы 2.** У розныя часы гістарычнага развіцця асветнікі імкнуліся зберагчы родную мову і культуру, прымножыць яе багацце, данесці веды да шырокага кола чытачоў. Яны — гонар нашага народа, сведчанне яго цывілізацыі, культуры і адметнай самабытнасці.

# ЧЫТАЕМ РОДНЫ КУТ, ЯК КНІГУ

*Літаратурнае свята*

*Чытаем родны кут, як кнігу : раённае свята беларускага пісьменства і друку // Папка “Першадрукары, асветнікі, вучоныя”, 2008 г.*

## Пачатак свята на гарадской плошчы

**Бібліятэкар у ролі Азбукі:** Паважаныя жыхары і госці бярозаўскага краю, добрай раніцы!

Мы вельмі рады сустрэчы з вамі. Упершыню ў нашым горадзе супрацоўнікі бібліятэк раёна разам з чытачамі і беларускімі літаратурнымі героямі выйшлі на цэнтральную плошчу, каб зрабіць для вас свята, каб сказаць словы пашаны нашай добрай сяброўцы, дарадчыцы - беларускай кнізе, старажытнай і сучаснай, беларускім асветнікам і першадрукарам, а таксама словы падзякі ўсім, хто любіць чытаць.

Вы можаце здзівіцца: што тут варта павагі і шанавання?!

- Не скажыце! Сёння ў вас на шляху да кніжкі, бібліятэкі столькі перашкод, што не кожны здольны пераадолець яго: тэлевізар, камп’ютар, Інтэрнэт, мабільнік, проста гульні.

І ўсё ж большасць з вас, я спадзяюся, любіць і ўмее чытаць.

Вось яна ідзе да нас – наша Іменінніца, яе Вялікасць КНІГА.

*(Пад фанфары выходзіць Каралева Кніга)*

**Кніга:** Дзень добры, дарагія мае сябры! Як добра, што напярэдадні Дня бібліятэк вы прыйшлі на свята, дзе сустрэнеце любімых герояў, дзе прасторна беларускаму слову, дзе гучыць мелодыя роднай, матчынай мовы.

*(Ідзе харэаграфічная кампазіцыя “Гучаць неразвонам акорды мелодыяй роднае мовы ” на верш Алены Усцілоўскай “Мелодыі шчасця спявае... ”. Па ходу на плошчы дзяўчынка выкладвае буквамі фразу “Шануйце родную мову ”)*

**Азбука:** Наша свята будзе праходзіць у гістарычным месце горада - на Бярозаўскім картузіянскім кляштары. Таму папросім намесніка старшыні Бярозаўскага райвыканкома Тарасюка Яўгена Якаўлевіча даць старт нашаму шэсцю па вуліцах горада.

*(Гучаць фанфары)*

**Азбука:** Сяброўкі мае, літары! Збірайцеся ў Азбуку!
Вяльможны падканцлер Казімір Сапега!
Ваша Вялікасць Каралева Кніга і Вашая світа!
Просім вас стаць уперадзе нашай калоны.
Паважаныя гледачы, далучайцеся да ўрачыстага ходу!
Святкуйма разам!

*(Калона ідзе па вуліцы Леніна да кляштара. Азбука тым часам рэкламуе бібліятэкі, кнігу)*

**Вядучы 1**: *(бібліятэкар у нацыянальным адзенні)*

Шчырае прывітанне вам, дарагія сябры!

Мы рады вітаць вас усіх на раённым свяце беларускага пісьменства і друку.

**Асветнік-летапісец:** На працягу 15 гадоў гэтае свята на узроўні рэспубліканскага вандрue праз усю Беларусь па правінцыяльных мястэчках, як сімвал адраджэння нашай краіны. Яно дапамагае ўсім нам убачыць бы ў павелічальным шкле нашы духоўныя набыткі, пакланіцца славутым продкам-асветнікам, якія сваім падзвіжніцтвам узбагацілі нацыянальную культуру, ушанаваць родную мову.

**Вядучы 1:** Слова для адкрыцця свята мае начальнік аддзела культуры Бярозаўскага райвыканкама ГАНЧАРКА Іна Георгіеўна.

*(У выступленні ідзе гаворка аб ролі КНІГІ, друкаванага слова ў жыцці чалавека, аб тэматычных пляцоўках у горадзе, аб месце правядзення ўрачыстасцей — кляштары картузаў. Перадае сімвалічны ключ, якім адчыняецца ўмоўная гістарычная Брама горада Бярозы вядучаму-летапісцу, які адчыняе Браму)*

**Чытальнік 1**: Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.
……………………………
І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсцеж раблю агледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з’едзены.
Жыве з ім дум маіх сям’я
І сніць з ім сны нязводныя
Завецца ж спадчына мая
Усяго Старонкай Роднаю.

*Янка Купала. Спадчына*

*(Гучыць песня “Янка Купала ” на сл. Ул.Някляева, муз. Ул.Будніка. Адначасова фонам ідуць кадры кінастужкі аб горадзе Бярозе, падрыхтаванай*
*да яе 530-годдзя)*

**Летапісец:** Імкліва бягуць гады... Нашаму гораду ўжо больш пяці вякоў.

Нават для гісторыі — гэта не імгненні. А для чалавецтва - прамежкі агромністыя. Але колькі б часу ні прайшло, гісторыя жыве ў нас барвовымі мурамі кляштара картузаў, разбуранымі сценамі Чырвоных казармаў, абеліскам вязням ізаляцыйнага лагера Бяроза-Картузская, помнікамі загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны, крыжамі на купалах Свята-

Петрапаўлаўскай царквы, памятным знакам з трыма гербамі на скрыжаванні галоўных вуліц горада.

**Вядучы**: Каб поўнасцю адчуць сувязь часоў, каб зразумець, што не толькі ў помніках наша гісторыя, варта сёння згадаць таксама ІМЕНЫ людзей, якія не шкадавалі ні сябе, ні сваіх сродкаў дзеля адукацыі і асветы роднага краю.

Каб яшчэ раз пераканацца, што наша жыццё - гэта працяг жыццяў нашых продкаў, а тое, што вакол нас, - гэта след іх жыцця.

**Чытальнік 2:** *(Грае на дудачцы)*

З крыніцы высохлай - ваду не піць.
Гукаю продкаў. Блізкіх і далёкіх.
Гукаю песняй: песня тая ніць,
Што дні, гады, вякі нітуе легка.
Ёй дагукацца, ёй знайсці ў былым
разгадку нашай згоды - і нязгоды –
Жыць толькі тым, што дадзена, - сваім,
адзіна, як здаецца, мэтазгодным.
Не права - абавязак: не забыць,
адкуль, чые мы, чым мы часу плацім...

**Вядучы 1:** Мы можам ганарыцца слаўнай гісторыяй нашага пісьменства і друку : “Нам пісьмёны не за грошы зберагалі продкі...”, - сказаў беларускі паэт Сяргей Панізьнік. Мы вымаўляем сёння з гонарам сусветна вядомыя імёны: Кірыла Тураўскі, Ефрасіння Полацкая, Францыск Скарына, Пятро Мсціславец, Сымон Будны, Васіль Цяпінскі, Сімяон Полацкі, Спірыдон Собаль. Гэты славуты рад можна доўжыць і доўжыць... Яны ўсе пракладвалі дарогу КНІЗЕ, СЛОВУ.

*(Гучыць фанаграма беларускага матыву)*

**Чытальнік 3:** *(Трымае ў руках энцыклапедычнае выданне)*

Я дастану са скарбніц, сваіх невычэрпаных сховаў
Кнігі з пахам вякоў, дзе бурштыннай крыніцай звініць
Беларускага княства вялікаліцвінскага слова,
Каб яднання часоў не ірвалася крэўная ніць.
Тут са мной размаўляюць Скарына, Цяпінскі і Будны
Ў роднай мове, з якою на вет Бог пусціў.
Гэта вечная плынь, і няхай не святкуе аблудны –
Засціці слова, як сонца, нікому не ўдасца ў жыцці.
Учытайся, пачуеш - яно ў нас жывое спрадвеку,
І сягоння чаканіць прасветлена ўзнёслы радок.
Мовы скарб зберажом, каб сябе пачуваць чалавекам,
Каб штодня даваў моцы айчынны гаючы глыток.

*Уладзімір Мароз. Старажытнае слова*

*(Гучыць бел. нар. песня “За рэчкаю, за ракой” у выкананні дзіцячага фальклорнага калектыву)*

**Летапісец:** У КНІЗЕ гісторыі Бярозаўшчыны застанецца навекі імя КАЗІМІРА САПЕГІ, нашчадка літоўскага канцлера Льва Сапегі. У 1648 годдзе ён запрасіў з Варшавы ў Бярозу італьянскіх архітэктараў, каб пачаць будаўніцтва кляштара, і ахвяраваў на гэтую справу вялізную суму грошай.

Падканцлер Сапега: *(на фоне музыкі Міхаіла Клеафаса Агінскага)*

... Гэта дзіўнае месца. І дзіўныя мае пачуцці... Сярод пляскатай раўніны на працягу 40 гадоў людзі стваралі гэтую таямніча-вялікасную прыгажосць: пад блакітным палескім небам паступова з'яўляліся муры архітэктурнага збудавання - белыя тынкавыя будынкі і смарагдавыя дахі, пакрытыя зялёна-паліванай дахоўкай; двухпавярховы палац ва ўнутраным дворыку, у які я прыязждаў з сям'ёй на адпачынак; буйныя сады, аранжэрэі і, зразумела, БІБЛІЯТЭКА. З братам Янам мы ніколі не шкадавалі грошай на кнігі і з радасцю аддавалі іх у кляштарную бібліятэку.

*(Павольна пакідае сцэну. У гэты час да шафы з старажытнымі кнігамі падыходзіць 1 альбо некалькі манахаў)*

**Манах 1:** З двух тысяч тамоў кніжнага збору нашай багатай бібліятэкі мы карысталіся, у першую чаргу, свяшчэннымі пісаннямі, літаратурай па тэалогіі, гісторыі царквы, філасофіі, сусветнай гісторыі. У гэтых шафах можна было знайсці слоўнікі і даведнікі, навуковыя працы вучоных-сучаснікаў па геаграфіі, астраноміі, батаніцы, медыцыне, праву.

**Манах 2**: Мы валодалі бясцэннай кніжнай скарбніцай: сярод іншых правінцыяльных кляштарных бібліятэк Віленскага біскупства бярозаўскі кніжны збор саступаў толькі зборам кармелітаў у Глыбокім і дамініканцаў у Гродне. Тут захоўваліся кнігі на лацінскай, нямецкай, польскай, галандскай, французскай, чэшскай мовах. У асноўным гэта былі друкаваныя выданні. Ад рукі пісаліся "абрадавыя кансцёльныя кнігі - дапаможнікі" для правядзення літургіі. Мы таксама перапісвалі і перапляталі кнігі.

**Летапісец:** У час існавання касцёла над яго дзвярыма вісела мрамарная дошка з надпісам на латыні. Гэта былі словы прадасцярогі ўлюбенага ў Бярозу князя Сапегі нам, хто павінен быў зберагчы для будучых пакаленняў пабудаваную ім святыню.

**Вядучы:** Прыгожая і высокая ідэя пачаць работы па аднаўленню непаўторнага помніка архітэктуры XVII стагоддзя жыве ў галовах мясцовых краязнаўцаў, гісторыкаў і навогул шчырых знаўцаў роднага бярозаўскага краю. Шкада, што магнаты накшталт Сапегаў не жывуць сярод нас, каб дапамагчы дзяржаве вярнуць усю прыгажосць грандыёзнай забудовы, якая размяшчалася на плошчы звыш шасці гектараў тры з паловай стагоддзі таму назад.

**Летапісец:** Сёння на нашым свяце прысутнічае госця са сталіцы, наша зямлячка Валянціна Васільеўна Смеян, аўтар эскізнага праекта добраўпарадкавання картэзіянскага кляштара. Дадзім ёй слова.

*(Выступленне В.В. Смеян)*

**Вядучы:** *(Гучаць цымбалы)* ... Бярозаўшчына , як разгорнутая Кніга: лістай, усведамляй, атрымлівай асалоду ад дачынення да культуры

Бацькаўшчыны. У яе палёў-лясоў пазычыў сілу не адзін дзесятак творчых і таленавітых асоб. Яны пішуць кнігу ўласнай зямлі, кожная старонка якой для нас - адкрыццё і ўрок сумленнага служэння слову, адукацыі, нацыянальнай культуры. Праз усё сённяшняе шматгалоссе новых паэтычных рытмаў, сугучных новаму часу і новым падзеям, як крыштальны звон, прабіваецца строгая музыка вершаў Алеся Разанава, Ніны Мацяш, Раісы Баравіковай. Яны - сумленныя беларусы, якія маюць гонар абвясціць свае адносіны да роднай зямлі.

*(Чытае на фоне мелодыі цымбал)*

**Чытальнік 1:** Радзіма, да цябе з мальбой
і нараканнем
не скрануся.
Я ў весялосці не з табой,
з табой у роздуме і ў скрусе.
Высвечвала бяздонным дном,
ў акно ўзіралася з'інела,
і ведзьмавала туманом,
і летам бабіным звінела.
Калі будзіла весялосць?!
А прахаплюся - ты ўсё будзіш.
І мне няўцям, адкуль ты ёсць,
адкуль пасля з'яўляцца будзеш.
Ты не ўмяшчаешся ў куток,
дзе трызніць Буг, дзе Белавежа...
Твае не вызначыць мне межы
і не намацаць твой выток.
У свет балючы дабяла,
у снежны свет, мае усходы
ідуць: там ты... там ты была!..
Ты ўся наводдалі заўсёды.

*А. Разанаў. Радзіма*

**Чытальнік 2:**
Спытаюцца? "Адкуль ты?
Скуль ты родам?"
І адкажу:
- 3 палескай той раўніны,
Якая з даледавіковых часаў
Пароднена і з доляй, і з нядоляй.
О, нездарма яна, мая старонка,
І Белым возерам глядзіць,
Як вечнасць,
І Чорным возерам глядзіць,
Як памяць...
Бярозаўшчына!

Жылкаю блакітнай
Пульсуе Ясельда ў цябе на скроні.
Вясёлыя гаі твае бярозавыя
Нітуюцца з барамі ды з дубровамі,
Каб з травамі, імхамі, чаратамі

Няўзнак на ўвесь зеленасвет Еўропы важыць.
А ці ж не так і чалавечы лёс твой
Панітаваны з лёсам чалавецтва,
Мая Бярозаўшчына?!
……………………………………
Гляджу на жытнія разлогі кута роднага
І думаю:
Хай ясніцца Твой дзень,
Хай непарушна мірным будзе неба.
……………………………………..

*Н. Мацяш. Візітоўка*

**Чытальнік 3:** Прыводзяць шляхі-дарогі
Да Белай Вежы на ўзлессі!
Як да бацькоўвага парога
Іду да цябе, Палессе!
Сумую - мой лёс-гарэза
Выносіць на хвалях хуткіх
У чысты да слёз бярэзнік,
У царства алешын гнуткіх.
Бывала ў далонях люляла,
Тулілася целам гарачым,
Рамонкам заўсёды ўяўляла
Цябе ў летуценнях дзіцячых!
І бегла, дзе жыта радзіла,
Збожжа насіла ў вядзерцы,
Іду дя цябе, Радзіма,
З матчынай песняю ў сэрцы!

*Р. Баравікова. Прыводзяць шляхі-дарогі*

*(Гучыць песня "Бярозаўскі вальс" на сл. А.Усцілоўскай, муз. А.Говін)*

**Вядучы:** Родная мова, матчына мова... Яна павінна ўваходзіць у наша жыццё з маленства, з вуснаў маці. У Вялікім Княстве Літоўскім на беларускай мове пісаліся ўсе законы, вяліся ўсе ўрады і суды. З тых часоў захавалася шмат дакументаў: кніг, грамат, загадаў. Гэта была дзяржаўная мова.

А як добра ВЫ ведаеце родную мову? Зараз паглядзім.

Вядучы віктарыны: *(Праводзіць віктарыну "Шануй роднае слова". Глядзі "Дадатак № 1)*

*(Гучыць бел. нар. песня “Ой, я малада ”)*

**Летапісец:** Духоўную энергію слова, мовы нельга скарыстаць, калі не прыкласці аніякіх намаганняў. Каб ведаць родную мову, каб адчуць яе прыгажосць трэба сябраваць з кнігай. Не зразумее сутнасці, значэння роднага слова для росту душы, не пачуе яго ўнутраную музыку чалавек, які зарыентаваны на жыццё толькі ў свеце матэрыяльных каштоўнасцяў.

**Вядучы**: Не адгукнецца, не памкнецца да жыццядайнай крыніцы Слова душа, прывязаная толькі да свету фізічнага. А шматлікія перапісчыкі кніг, нашы першадрукары і іх паслядоўнікі ўсяляк імкнуліся падключыць сваіх супляменнікаў да разумення агульных законаў уладкаванасці свету, да агульначалавечае культуры, да пошукаў ісціны.

**Летапісец:** Каталогі нашых старадрукаў і рукапісных кніг пацвярджаюць, як добра шчыравалі беларусы ў мінулыя стагоддзі на ніве роднага слова:

**Чытальнік 1:**

Казаў Скарына: у навуках вольных
І ў творчасці каб поспех атрымаць,
Ты заручыся з прагай неспатольнай –
Чытаць!
Каб граматай валодаць дасканала,
Каб годна і дакладна напісаць,
Табе самім жыццём наканавана –
Чытаць!
Каб з логікай было ўсё складам-ладам,
Каб мог вузлы жыццёвыя звязаць,
Табе патрэбна, нібы лёд Калядам, -
Чытаць!
Каб з красамоўствам крочыць шляхам верным,
Згрызотаў нежаданых не спазнаць,
Патрэбна чалавеку, як паветра, - Чытаць!
Чытаць!
Чытаць!

*В. Лукша. Вучыў Скарына...*

**Вядучы:** Ніва Слова страчвае сваю моц без самаахвярных ратаяў, без тых, хто клапоціцца пра яе штодня. Сёння надзвычай запатрабавана людзьмі праўдзівае, сумленнае і адказнае слова журналіста. Творцы нашай раённай газеты “Маяк” прафесіянальна і зацікаўлена пішуць Кнігу сучаснасці і вучаць нас, як ведаць уласную зямлю, упрыгожваць яе ды ўшаноўваць. Да вас звяртаецца намеснік галоўнага рэдактара газеты Карпеш Разалія Станіславаўна.

*(Выступленне журналісткі)*

**Вядучы:** У бібліятэкі гарадоў і вёсак нашага раёна штогод прыходзяць звыш трыццаці тысяч чытачоў. 2008 год аб’яўлен Годам літаратуры і

чытання ў краінах Саюза Незалежных Дзяржаў. У бібліятэках Бярозаўшчыны ён адзначаны раённым конкурсам на лепшую папулярызацыю айчыннай літаратуры “Тэатр беларускай кнігі ў бібліятэцы”.

Творчасць беларускіх пісьменнікаў усіх часоў - невычарпальная крыніца прыгожай роднай мовы, якая сёння - гаспадыня нашага свята.

*(Тэатралізацыя п’есы Васіля Жуковіча “Гаваруны”)*

*Летапісец*: Паважаныя сябры! Яе вялікасць КНІГА запрашае на сцэну вашых знаёмых і сяброў - герояў літаратурных твораў.

На момант раённага конкурсу і нашага свята вобразы персанажаў ахвотна ўвасобілі актыўныя чытачы і бібліятэкары.

Цэрымонню ўзнагароджвання пераможцаў праводзіць дырэктар ЦБС Макарэвіч Ірына Львоўна.

*(Ідзе прадстаўленне і ўзнагароджванне бібліятэк-пераможцаў конкурса, лепшых чытачоў і пераможцаў віктарыны “Зерні слова — наша збожжа, якая друкавалася на старонках газеты “Маяк ” напярэдадні. Глядзі “Дадатак № 2 ”)*

**Азбука:** Літаратурныя героі Бярозаўскай гарадской бібліятэкі: пан Кубліцкі і пан Заблоцкі. Ото ж былі паны! Колькі гузоў назараблялі на свае галовы - усе праз фанабэрыю, працавітасць, недарэчныя дзівацтва.

**Кніга**: Сакалоўскую сельскую бібліятэку наведалі: славутая купалаўская Паўлінка, хлопчык з вясёлым імям - Вася Вясёлкін, задзірака, буян Саўка, плаксівая прынцэса Ружа, яе бацькі - Кароль і Каралева, бедны Музыка.

**Азбука:** Чытачы Белаазёрскай дзіцячай бібліятэкі пераапрануліся ў казачных герояў п’есы - казкі Францішкі Аляхновіча “У лясным гушчары”.

**Кніга**: Бібліятэкар Марэвільскай сельскай бібліятэкі Вольга Іванаўна Лухтан (яна сёння - Азбука) паклікала да сваёй аўтарскай п’есы “Цуд у бібліятэцы” многіх прыгожых герояў: Несцерку, Лявоніху, Бабу Ягу, Разумную дачку, Антоніка - Поніка, Алёнку.

**Азбука:** Сустракайце! Чытачы-літаратурныя героі Цэнтральнай раённай дзіцячай бібліятэкі: Дзед Усявед, Казачнік Бай, Кот Мараход.

**Кніга**: Маленькія чытачы Зарэчскай сельскай бібліятэкі добра ведаюць і любяць казкі хітрага дзеда-пісьменніка Уладзіміра Ліпскага.

**Азбука:** Кнігалюбы Першамайскай сельскай бібліятэкі сёння выступаюць у ролях: рыцара Янука, Панны, Лесавічка. Гэтых герояў сярэднявякоўя прыдумала сучасная пісьменніца Людміла Рублеўская.

**Кніга:** А гэтых літаратурных герояў вы толькі што бачылі: на нашым свяце - каларытныя гаваруны Васіля Жуковіча з Падкраіцкай сельскай бібліятэкі.

**Азбука**: А хто ж гэта крочыць, такая прыгожая і з ганарлівай постаццю! Здаецца мне, гэта Чорная Панна Нясвіжа - Барбара Радзівіл з каханым! Іх мы сустрэлі ў Пескаўскай сельскай бібліятэцы.

**Кніга**: Рачыцкая сельская бібліятэка на час конкурсу ператварылася ў хату, поўную казачных герояў. Запрашаем да гурту: Сінявочку-Крынічку Аляксея Дударава, хітрую Лісу з казкі Валянціна Лукшы, Янку Запытанку - героя вершаў Вольг Іпатавай, хлопчыка Васілька з твораў Еўдакіі Лось.

**Азбука**: Бойкія дваровыя пастушкі Лявонка і Грышка, а таксама іх аднавяскоўцы: Вацік, Ядзя, Марыська, Юзік, Янка прыйшлі на свята са Светацкай сельскай бібліятэкі.

**Кніга:** Чытачы Сялецкай сельскай бібліятэкі добра ведаюць герояў рамана Якуба Коласа "На ростанях" Лабановіча, Ядвісю, бабку Ганну.

**Азбука**: У Спораўскай сельскай бібліятэцы чытачы вельмі сябруюць з балагурам, весялуном, сапраўдным беларусам Несцеркай і знакамітай Бабай Ягой, Алесяй, Ракам-вусачом.

**Кніга:** Герояў-жывёл і птіц з твораў Васіля Зуёнка, касцюміравалі кнігалюбы Стрыгінскай сельскай бібліятэкі. Іх многа: Сава, Дзяцел, Страказа, Сарока, Варона, Баран.

**Азбука:** Прыгожых чытальнікаў-дэкламатараў, знаўцаў беларускай паэзіі - супрацоўнікаў цэнтральнай раённай бібліятэкі ведаюць у Бярозе многія. Вось і сёння яны ўпрыгожваюць сваім выступленнем наша свята.

*(Гучыць музычны номер у выкананні інструментальнага трыа)*

**Вядучы**: Бярозаўская зямля ўрадлівая на людей няўрымслівых і творчых. Немагчыма не захапляцца непаўторнай прыгажосцю роднага краю на палотнах мастакоў, дзе кожны стварае свой вобраз гэтай прыгажосці. Жывой крыніцай б'юць і зачароўваюць нас непаўторныя песні.

*(Гучыць бел. нар. песня "Канюшня" у выкананні дзіцячага фальклорнага калектыва)*

**Летапісец:** Цяжка ўявіць нам, ці было б магчымым духоўнае станаўленне людзей, ды і ўвогуле выхаванне маладога пакалення без кнігі. Сучасная Беларусь любіць і шануе кнігу. Наш гонар - Нацыянальная бібліятэка, кніжныя выдавецтва, сродкі масавай інфармацыі, паліграфічная база. У нашай краіне штогод выпускаецца ў свет амаль 11 тысяч назваў кніг агульным тыражом больш за 40 мільёнаў экзэмпляраў. Сёння ў Беларусі зарэгістравана больш як тысяча газет і часопісаў, 8 інфармацыйных агенстваў, звыш двухсот тэлевізійных - і радыёпраграм. Таму невыпадкова, што Дзень беларускага пісьменства - сапраўды народнае свята, свята кожнага, хто шануе родную мову, культуру, традыцыі.

**Вядучы:** ... Зерні ведаў, культуры, пасеяныя картузамі на бярозаўскай зямлі ў 17 стагоддзі прараслі сёння добрымі ўсходамі. І мы ніколькі не сумняваемся: наша свята нагадала ўсім нам, што пачаткам усяму стала Слова, а потым нарадзілася Кніга, і ўсім нам наканавана напісаць у ёй сваю незабыўную старонку!

*(Гучыць музыкальная фанаграма)*

**Чытальнік 2:**

... ў гэтым нялёгкім сусвеце
Мы чытаем,

Мыслім,
Мы дзейнічаем,
Мы.
Мы, што больш за ўсіх чытаюць на свеце.
Кнігі - сябры.
Іх кідаюць перш за ўсё.
Але ўсё ж Чалавек
Выходзіць пад бомбы ў дарогу,
Захапіўшы з сабой
Акрым шчоткі зубной
Багдановіча, Танка, Купалу,
І Коласа, й Панчанку,
І Эклезіяста,
І - у сэрцы - Бога.
Калі здарыцца горшае,
Калі будуць паліць
(А папера палае легка і весела),
Каб прапраўнукам не забыць
Усё сваё,
Дарагое:
Наш свет —
Ад сонца да месяца.
Кнігі - сябры.
Іх кідаюць перш за ўсё.
Але ў сэрца яны застаюцца,
Як памяць нятленная.
Бо яны - гэта мы,
Бо яны - “Гэта рэкі суць,
Рэкі, што назаўжды
Пяюць вечную нашу ўсяленную”.

*Ул. Караткевіч. Кнігі*

*(Гучыць узнеслая мелодыя “Беларусь ты мая ”)*

**Вядучы:** Вось і падышло да канца наша свята, прысвечанае Дню беларускага пісьменства і друку, Дню бібліятэк. Спадзяемся, што яно стане ў нашым раёне традыцыйным.

**Летапісец:** Ёсць мара, што калісьці ў спіску сталіц рэспубліканскіх урачыстасцей да Дня беларускага пісьменства і друку будзе названа і наша невялічкае мястэчка з імям Бяроза.

**Вядучы:** Бо менавіта беларуская глыбінка - адзіная крыніца, з якой бярэ выток і шчодра бруяе беларуская мова, першародная, шчырая, сапраўды народная.

Хай будзе добра роднаму Слову ў нашых шчырых сэрцах, ў нашых праўдзівых вуснах.

**Летапісец:** Ты, мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовы сваёй не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.

**Вядучы 1**: Дык шануй, Беларус, сваю мову -
Гэта скарб наш на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!

*Алесь Гарун. "Ты мой брат, каго зваць беларусам... "*

(Гучаць песні ў выкананні народнага калектыва нар. песні "Заранак": "Беларусь ", "Лядзецкая полька ", "Ночка цёмная ")

**Вядучы, летапісец:** Паважаныя сябры! Свята для вас падрыхтавалі: супрацоўнікі бібліятэк цэнтрадізаванай бібліятэчнай сістэмы, удзельнікі народнага ансамбля народнай песні "Заранак", артысты народнага тэатра гарадскога Дома культуры, дзіцяча-юнацкага спартыўна-эстэтычнага цэнтра, фальклорны калектыў дзіцячай школы мастацтваў.

Да пабачэння, да новых сустрэч, сябры!

*Дадатак № 1*

## ВІКТАРЫНА
## "Шануй роднае слова"

Паважаныя сябры! Зараз я прачытаю вам некалькі ўрыўкаў з беларускіх вершаваных твораў, ну, напрыклад з паэмы Я. Коласа "Новая зямля". Упэўнена, што сярод вас няма такіх, хто не ведае хто такі Якуб Колас. Дык вось, я прачытаю ўрыўкі з паэмы "Новая зямля", а вы павінны знайсці ў іх словы, якія, на жаль, знікаюць з нашае сучаснае мовы.

*Дзень быў святы. Яшчэ ад рання*
*Бліны пякліся на сняданне,*
*І ўжо пры печы з* ***чапялою***
*Стаяла маці ... Пад рукою*
*Таўкліся дзеці, заміналі,*
*Або смяяліся, спявалі.*

Ну што, знайшлі незнаёмае слова? Правільна. Чапяла. **Чапяла** - гэта жалезны кручок, насаджаны на палку. Ім дастаюць скавараду з пячы. Цяпер другі ўрывак:

*Услон заняў сваё ўжо месца,*
*На ім стаяла дзежка цеста,*
*І* ***апалонік*** *то і дзела*
*Па дзежцы боўтаў жвава, смела.*
*І кідаў цеста ў скавародкі.*

А якое незнаёмае слова вам сустрэлася ў гэтым ўрыўке? Правільна, апалонік. **Апалонік** - гэта вялікая лыжка, якой разліваюць страву. (Поварешка)

Слухаем далей:

*Давала цеста піск кароткі,*
*Льючыся з шумам на* ***патэльні,***
*І ў жар стаўлялася пякельны.*

Так, правільна, патэльня. **Патэльня** - гэта скаварада.

Слухаем уважліва далей:

*Алеська! Скокні, брат, вазьмі ты*
*Ў хаце* ***тарачку*** *на печы!*
*Ну, варушыся ж ты, старэчы!*
*Наўкол пляменнікі сядзелі,*
*На дзядзьку пільна ўсе глядзелі,*
*Як ён, рукавы закасаўшы*
*Па тарцы шоргаў, шапку зняўшы!*

Так, **тарка** - гэта металічная пласцінка з дзіркамі, якая служыць для раздраблення, расцірання чаго-небудзь.(Терка)

- *Ну, небажаты, будзем снедаць –*
*Ў людзей садзяцца ўжо абедаць.*
*Цягні мачанку, маці, з печы!*
*За стол малы, за стол старэчы! –*
*Гаворыць дзядзька, сам сядае*
*І стол* ***абрусам*** *засцілае.*

**Абрус** - гэта пакрывала для стала; настольнік.

Увага!

*Прад ім стаяў гаршчок і міска,*
*І кошык з бульбай; тут жа блізка*
*Відзен і збан быў паліваны,*
*Да палавіны ў дол укапаны.*

Якое слова тут вам незнаемае? Збан? **Збан** - гэта гліняная пасудзіна, якая мае ручку і носік.(Кувшин)

*Мы днём лятаці, як стрыжы.*
*Займала дух; І сохла ў роце*
*А маці мыла* ***гладышы.***
*Абсохнуць вешала на плоце.*

Ну і што азначае слова **гладыш**? Гэта збан, толькі без ручкі і з шырокім верхам.

Слухайце наступны ўрывак:

*Алесь, Кастусь і Міхаліна*
*На працу выйшлі самі.*
*І падмялі двор* ***дзеркачамі.***

А **дзяркач** - гэта стары венік без лісця.

І апошні урывак:
Зачуўшы татаў ход знаёмы,
Малыя з хаты высыпалі.
За брамай бацьку сустракалі.
Алесь браў стрэльбу, шапку з цешкай
І нёс з шчасліваю ўсмешкай
А Костусь - торбу з **кутасамі**
І знак блішчасты стражнікоўскі.

**Кутасы** - гэта ўпрыгожанне: пучок нітак на канцы пояса, на адзенні.(Кисти)

А зараз, сябры, мы пагуляем у гульню, якая называецца "перакладчык". Перакладчык - гэта прафесія, людзі перакладаюць на родную мову аповесці і апавяданні, вершы і навуковыя артыкулы. Без іх не абходзіцца сустрэча з замежнымі гасцямі.

Хто хутчэй перакладзе з рускай мовы на беларускую наступныя словы, той і будзе перакладчыкам:

| | |
|---|---|
| ЛИСТ | АРКУШ |
| КАРАНДАШ | АЛОВАК |
| СТЕРКА, ЛАСТИК | ГУМКА |
| РЕМЕНЬ | ПАСАК |
| ПЛАКСА | РУМЗА |
| КОПИЛКА | СКАРБОНКА |
| ЛОМОТЬ | ЛУСТА, СКІБА |
| ГОРБУШКА, КРАЮХА | АКРАЕЦ |
| БАРХАТ | АКСАМІТ |
| УЛИТКА | СЛІМАК |
| БЕСЕДКА | АЛЬТАНКА |
| БАНКА(стеклянная) | СЛОІК |
| КОРШУН | ШУЛЯК |

Вашы дружныя адказы паказалі, што вы добра ведаеце беларускую мову і сябруеце з ёю. Мне вельмі хацелася б, каб і далей ваша сяброўства было такім (плённым) зацікаўленным і прынесла вам у жыцці вялікую карысць.

*Дадатак № 2*

**Паважаныя прыхільнікі**
**беларускай мовы, літаратуры і гісторыі!**

У рамках урачыстасцей да Дня беларускага пісьменства і Дня бібліятэк, якія пройдуць з 1-15 верасня аддзел бібліятэчнага маркетынгу цэнтральнай раённай бібліятэкі прапануе вам прыняць удзел у віктарыне "Зерні-словы - наша збожжа".

1.У якім годзе выйшла першая друкаваная кніга на беларускай мове? Хто з'яўляецца яе першадрукаром?

*(6 жніўня 1517 года Ф.Скарына выдаў "Біблію", пераведзеную на беларускую мову)*

2.На працягу колькіх год праводзіцца Свята беларускага пісьменства і друку ў Беларусі?

*(на працягу 15 год з 1994 года)*

3.Якія гарады былі сталіцамі гэтых Святаў?

*(Полацк - 1994 і 2003 г.г., Нясвіж - 1997 г., Орша -1998 г., Пінск - 1999г., Заслаўе - 2000 г., Мсціслаў — 2001 г., Мір - 2002г., Камянец- 2005г., Паставы - 2006г., Шклоў - 2007 г., Барысаў - 2008 г.)*

4.Хто з беларускіх асветнікаў увайшоў у гісторыпо кнігадрукавання? Назавіце іх імены.

*(Ф.Скарына,Е.Полацкая,С.Будны, В.Цяпінскі, І.Фёдараў, П.Мсціславец, С.Полацкі, К. Тураўскі)*

5.Пералічыце дзяржаўныя выдавецтвы Беларусі. Колькі іх?

*("Литература и искусство", "Мастацкая літаратура", "Беларусь", "Юнацтва", "Беларуская энцыклапедыя ім. П.Броўкі", "Беларуская навука", "Вышэйшая школа", "Народная асвета", "Полымя", "Універсытэцкае")*

6.Назавіце «тоўстыя» літаратурна-мастацкія беларускія часопісы.

*("Всемирная литература", "Неман", "Полымя", "Маладосць", "Дзеяслоў")*

7.Імены якіх вядомых пісьменнікаў - землякоў вы ведаеце?

*(Н.Мацяш,Р.Баравікова, А.Разанаў,В.Супрунчук, А.Казловіч, З.Дудзюк, С.Амяльчук, М.Гаравая, В.Осіпава, В.Раіцкі, В.Сіпягін)*

8.З якога года пачала сваю дзейнасць Нацыянальная бібліятэка Беларусі?

*(1922 г.)*

9.Пад якой назвай і ў якім годзе выйшаў першы нумар сучаснай раённай газеты «Маяк»?

*("Полымя ", 1944 г.)*

10.Калі быў пабудаваны кляштар картэзіянцаў у Бярозе? Хто з'яўляецца яго заснавальнікам?

*(1948 г., Казімір Сапега)*

11.У якім годзе у г. Бяроза была адкрыта грамадская бібліятэка?

*(1946 г.)*

12.Пад якой назвай і ў якім годзе выйшаў першы нумар сучаснай раённай газеты «Маяк»?

*("Полымя", 1944 г.)*

13.Што азначае слова "кляштар"?

*( Каталіцкі манастыр)*

**Спяшайцеся за адказамі ў свае бібліятэкі!**

Пераможцы атрымаюць узнагароды падчас свята "Чытаем родны кут, як Кнігу", якое адбудзецца на тэрыторыі картэзіянскага кляштара **14 верасня ў 11 гадзін.**

Адказы прысылаць да 7 верасня на адрас: 225210 г. Бяроза, вул. Кастрычніцкая, 29. Аддзел бібліятэчнага маркетынгу. Патрэбную інфармацыю можна атрымаць па тэлефону 2 20 36.

**Жадаем вам поспехаў!**

*Дадатак № 3*

**Распрацоўка**
**кніжна-ілюстраванай выставы**
**“Бярозаўшчына кніжная”**

**Раздзел І. “Старадрукі праз стагоддзі”**

У раздзеле прадстаўлены старажытныя кнігі, падшыўкі газет, афішы, фотаальбомы і іншая друкаваная прадукцыя з запаснікаў краязнаўчага музея і кніжнага фонда ЦБС.

**Раздзел ІІ. “Землякі, майстры слова - у друку”**

Рэкламуюцца імёны таленавітых літаратараў Бярозаўшчыны: А.Разанава, Р.Баравікавой, Н.Мацяш, В.Сахарчука, В.Супрунчука, А.Казловіча, М. Шыманскага, Я.Сялені, І.Кізнера, К.Дроня, М.Гаравой, В. Раіцкага, М. Пейгана, В.Осіпавай, А.Усцілоўскай і г.д.

**Раздзел ІІІ.“Пра тое, што хвалюе”**

Раздзел запаўняюць публікацыі на актуальныя злабадзенныя тэмы ў раённым, абласным, рэспубліканскім друку, аўтарамі якіх з’яўляюцца бярозаўскія журналісты, актыўныя грамадскія карэспандэнты.

**Раздзел ІV. “Мясцовая выдавецкая прадукцыя”**

Раздзел прадстаўляе рэкламна-інфармацыйныя выданні Бярозаўскага райвыканкома, аддзела культуры, цэнтралізаванай бібліятэчнай сістэмы, грамадскага аб’яднання Бяроза-Картузская імя Казіміра Сапегі і інш. Гэта будуць: брашуры “Бярозе-525”, “Бярозе-530”, “Бярозаўшчына - наша Бацькаўшчына”, газета “Маяк”, бюлетэнь-дайджэст “Гістарычная брама”, духоўна-асветніцкі часопіс «Картуз-Береза”, серыйныя бібліятэчныя выданні: «Где вы заповедные, заветные места», «Береза библиотечная», «Из архивов историко-краеведческого музея», «Поэты Березовщины:проба пера», “Бярозаўшчына кніжная” і інш.

Цытата:

*“Не толькі і жыве чалавек хлебам або лекамі,*
*але найбольш уселякім словам.*

*Францыск Скарына*

Цытата:

*“Вобразная, вольная, пявучая*
*Мова беларуская мая”*

*Пімен Панчанка*

Цытата:

*“Разам з намі шукае дарогу да храма і мова ”*

*Уладзімір Мароз*

*Дадатак № 4*

**РЭКЛАМА**

**аматарскіх аб'яднанняў бібліятэк-канкурсантаў**

1.Чытачы і ўдзельнікі лялечных гурткоў **раённай дзіцячай бібліятэкі**.

2.Чытачы-удзельнікі дзіцячага аматарскага аб'яднання "Дамавёнак" **Белаазёрскай дзіцячай бібліятэкі.**

3.Кнігалюбы клуба "Чытаем, вучымся, гуляем" **Падкраіцкай сельскай бібліятэкі.**

4.Тэатр слова актыўных і дапытлівых чытачоў **Марэвільскай сельскай бібліятэкі.**

5.Літаратурна-паэтычная група **Сялецкай сельскай бібліятэкі.**

6.Дружныя і бойкія чытачы, удзельнікі клуба "Вытокі" **Стрыгінскай сельскай бібліятэкі.**

7.Заўсёды кемлівыя і актыўныя кнігалюбы **Нарутавіцкай сельскай бібліятэкі**

8.Маленькія ды разумненькія дзяўчынкі і хлопчыкі - наведвальнікі **Зарэчскай сельскай бібліятэкі.**

9.Прыхільнікі чытання твораў беларускіх пісьменнікаў **Першамайскай сельскай бібліятэкі.**

10.Добрыя знаўцы беларускіх казак **Спораўскай сельскай бібліятэкі.**

11.Дасціпныя і эрудаваныя юныя чытачы **Малецкай сельскай бібліятэкі.**

12.Улюбёныя ў сваю вёску і яе гісторыю чытачы-краязнаўцы **Пескаўскай сельскай бібліятэкі.**

13.Сапраўдныя сябры кнігі, тэатру і аднадумцы бібліятэкара - чытачы **Сакалоўскай сельскай бібліятэкі.**

14.Вясёлыя і бойкія кнігалюбы **Рачыцкай сельскай бібліятэкі**.

15.Добрыя знаўцы беларускага слова і творчасці пісьменнікаў Беларусі **Светацкай сельскай бібліятэкі.**

16.Тэатр кнігі **Кабакоўскай сельскай бібліятэкі.**

17.Сапраўдныя сябры кнігі і бібліятэкі — хлопчыкі і дзяўчынкі **з вёскі Бронная Гара.**

# ЕВФРОСИНЬЯ ПОЛОЦКАЯ: УЧИТЕЛЬ, ВОСПИТАТЕЛЬ И БИЛИОТЕКАРЬ: СОВРЕМЕННЫЙ ВЗГЛЯД

*Вусны часопіс*

*Евфросиния Полоцкая: учитель, воспитатель и библиотекарь: современный взгляд // Вечныя каштоўнасці / склад. Л. І. Макаранка, В. А. Тамашова. – Мінска : Красіка-Прынт, 2016. — С. 12-17. – (Бібліятэка прапануе : кніжная серыя).*

**Вступительное слово библиотекаря.**

В словах поэтов и мыслителей отражаются история народа, его славные дела. Белорусам есть чем гордиться — белорусская письменность имеет многовековые традиции. Праздник дает уникальную возможность встретиться с живым словом, участниками творческого процесса создания книг, газет и журналов. Приятно и радостно становится на душе от осознания того, что не перевелись еще преданные книге люди. Ведь независимо от своих увлечений и занятий в жизни мы должны много читать. Благодаря книге мы получаем, прежде всего, доступ к знаниям, идеям, духовным и моральным ценностям, к пониманию красоты и творческим достижениям человека.

Традиционно в День белорусской письменности мы вспоминаем имена основателей белорусского образования и письменности — Франциска Скорины, Кирилла Туровского, Евфросинии Полоцкой, Симеона Полоцкого и других.

Каждому белорусу со школьной скамьи знакомо имя Евфросинии Полоцкой. Но большинству из нас она представляется, скорее, героиней из сказки, так и оставшейся в своем далеком, недосягаемом времени.

Меж тем, личностью этой реальной женщины по сей день не перестают восхищаться те, кто знает о ее жизни чуть больше, чем написано в школьных учебниках. Что же отличало Евфросинию от обычной женщины?

